Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 341 (4247)
Пятніца, 25 сьнежня 1931 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Завяршыць збожжазагатоўкі да 1-га студзеня (1 стар.). А. КАРАЧУН, В. САМУЦІН, А. МАЛЬКОЎ — Агонь па ўхілістах да вялікадзяржаўнага шавінізму (2 стар.). ГЕРМАК, ІЛЬЮШЫН І., РОХЛІН С. — Супроць межшавіцтвуючага ідэалізму і мэханіцызму ў філёзофіі (3 стар.). А. ІВІН — Японская інтэрвэнцыя ў Манчжурыі і амэрыканская правакацыя (4 стар.).

Ільназаводам — поўную нагрузку. Статут с.-г. арцелі — абавязковы для ўсіх калгасьнікаў. Змагацца за 6 умоў тав. Сталіна — важнейшая задача нізавога друку, саўгасаў, калгасаў і МТС (1 стар.).

Бяз жорстнага змаганьня з ухіламі ў нацпытаньні немагчыма на справе ажыцьцяўляць ленінскую нацпалітыку (2 стар.).

З коранем вытруціць абязьлічку і ўраўнілаўку, якія тармозяць выкананьне прамфінпляну. Паскарэньне таваразвароту — вузлавая задача савецкага гандлю (3 стар.).

КІТАЙ — Баі за Цзіньчжоу (4 стар.).

Правал антысавецкай правакацыі (4 стар.).

Завяршыць збожжазагатоўкі да 1-га студзеня

Мы знаходзімся ў самай адказнай апошнай паласе збожжазагатовак. Засталіся, літаральна, лічаныя дні да сканчэньня тэрміну, вызначанага партыяй і ўрадам для поўнага выкананьня гадавога агульна-рэспубліканскага пляну. Чацьверты заключаны год пятдігодкі мы павінны сустрэць капчатковай перамогай на збожжазагатоўным фронце, пасьпяховым завяршэньнем хлебнай кампаніі.

У сьвятле гэтай баявой задачы асабліва недапушчальна тое адставаньне у збожжазагатоўках, якое мы маем зараз у БССР. У той час, як рад абласьцей і раёнаў СССР ужо выканаў і перавыканаў гадавыя заданьні па загатоўках збожжа, на нашай рэспубліцы плян на 30-га сьнежня ажыцьцёўлен толькі на 72,2 проц. Мы маем абсалютна усе магчымасьці для поўнай і своечасовай рэалізацыі збожжазагатоўчага пляну.

У чым жа заключаюцца прычыны адставаньня?

Яны ляжаць у першую чаргу і галоўным чынам у палітычнай недаацэнцы барацьбы за збожжа з боку некаторых раённых арганізацый, неразуменьні новай абстаноўкі, у якой праходзіць загатоўчая кампанія гэтага году, новых форм і мэтадаў клясавай барацьбы па вёсцы.

Яны ляжаць, па-другое, у агідных скрыўленьнях палітыкі партыі, у правапартуністычнай практыцы і «левых» загібах, дапушчаных паасобнымі работнікамі і арганізацыямі.

Яны ляжаць па-трацяе, у слабай, а месцамі поўнай адсутнасьці масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, у адсутнасьці рашучай барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі.

Чым растлумачыць, што **саўгасы** БССР дагэтуль усё яшчэ ня скончылі здачу збожжа, ня гледзячы на катэгарычную дырэктыву аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб «абавязковай здачы саўгасамі вызначанай плянам загатовак прадукцыі не пазьней 10-га сьнежня? На 21-га сьнежня толькі дзьве саўгасныя сыстэмы (Насентрэсту і Птушкатрэсту) поўнасьцю выканалі свае заданьні па здачы таварнага збожжа дзяржаве. Сыстэма **Сьвінаводтрэсту** выканала плян на 94,1 проц., **Садгародтрэсту** — на 90 проц., а асноўны збожжазагатоўца — **Малакопрамтрэст** зусім пляцнецца ў хвасьце і здаў збожжа толькі 65,2% пляну. За два дні — 19-га і 20-га сьнежня саўгасы Малакопрамтрэсту не здалі ніводнага цэнтнэра збожжа. У сярэднім саўгаснымі сыстэмамі рэспублікі гадавы плян выканан толькі на 77,3 проц.

Гэта вынік апартуністычнай спадчыны былога кіраўніцтва Белсаўгастрэсту, якая ўсё яшчэ ня зжыта ва многіх саўгасах. Дагэтуль яшчэ маюць месца спробы паасобных кіраўнікоў саўгасаў супроцьпаставіць месьніцкія інтарэсы агульна-дзяржаўным, забясьпечыць уласныя рвацкія патрэбы за лік выкананьня заданьняў па здачы збожжа. Яркім прыкладам можа служыць саўгас **Самузлева** (Койданаўскага раёну), кіраўніцтва якога апынулася ў палоне буржуазных тэндэнцый і замест здачы збожжа дзяржаве разбазарыла яго самым агідным чынам.

Партыя прад'яўляе саўгасам катэгарычнае патрабаваньне — поўнасьцю і неадкладна выканаць плян здачы збожжа. Баявая задача саўгасных партарганізацый і кіраўніцтва саўгасных сыстэм давесьці на спраге сваю здольнасьць змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі. Перабудоўваючы работу па-новаму на аснове шасьці ўказаньняў т. Сталіна, саўгасы павінны дабіцца рашаючай перамогі на важнейшым вучастку барацьбы за выкананьне сваіх вытворчых праграм — на фронце здачы збожжа дзяржаве.

У параўнаньні з іншымі сэктарамі, **калгасы** ідуць у авангардзе загатовак, у радзе раёнаў калгасы ня толькі выканалі, але і перавыканалі заданьні па здачы збожжа. Але ў цэлым па рэспубліцы тэмпы збожжазагатовак па калгасным сэктары застаюцца яшчэ **нездавальняючымі**. На 20-га сьнежня плян выканан толькі на 85,5 проц. між тым, як паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б плян здачы збожжа калгасамі павінен быў быць да 15-20-га сьнежня выканан **поўнасьцю**.

Адставаньне калгаснага сэктару ў радзе раёнаў зьяўляецца вынікам апартуністычнай ідэалізацыі калгасаў, неразуменьня, што **«прыдзецца яшчэ шмат папрацаваць над тым, каб перарабіць сялянина-калгасьніка, вытравіць яго індывідуалістычную псіхалёгію і зрабіць з яго сапраўднага труженіка сацыялістычнай грамадзкасьці» (Сталін).**

Зарука канчатковай перамогі ў збожжазагатоўках па калгасным сэктары — у разгортваньні шырокай масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў, арганізацыі іх на рашучую барацьбу з дробнаўласьніцкімі тэндэнцыямі адсталых членаў калгасаў. Трэба растлумачыць калгасьнікам, што рабочая кляса, якая ажыцьцяўляе кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі і аказвае вялізарную матар'яльную і арганізацыйную дапамогу калгасам, мае права патрабаваць і ад апошніх першачарговага выкананьня іх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. «Тыя калгасы, якія ня выконваюць пляну збожжазагатовак, ня могуць і не павінны карыстацца крэдытамі машынамі, машына-трактарнымі станцыямі і льготамі, устаноўленымі для калгасаў. Апіраючыся на перадавыя калгасы і на калгасныя масы, партыйныя арганізацыі павінны выкарыстаць збожжазагатоўкі, як выпрабаваную і магутную зборню арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і дабіцца выкананьня пляну збожжазагатовак усімі калгасамі». (Правда).

Самым адсталым вучасткам збожжазагатовак зьяўляецца **аднаасобны сэктар.** Пры агульным выкананьні пляну па рэспубліцы на 72,2 проц., заданьня па індывідуальным сэктары рэалізавана толькі на 64,3 проц.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 15-га ліпеня г. г. рашуча напярэдзіў усе партарганізацыі супроць «недаацэнкі ролі аднаасобнага сэктару ў выкананьні пляну збожжазагатовак, **у асаблівасьці спажываючых раёнаў».** (падкрэсьлена намі).

Факты гавораць аб тым, што недаацэнка ролі аднаасобніка мае месца ў радзе раёнаў нашай рэспублікі (**Шклоў, Слуцак** і інш). Толькі гэтым тлумачыцца, што ў некаторых раёнах аднаасобны сэктар цягнецца ў глыбокім тыле загатовак.

Ігнараваньне масавай работы сярод аднаасобнікаў, падмена яе ў асобных месцах мэтадамі голага адміністраваньня ў адносінах да бядняко ў і сераднякоў, адсутнасьць рашучага націску на кулацка-заможныя элементы, а часам і простае патураньне кулацтву — вось прычыны, якія прывялі некаторыя раёны да зрыву своечасовага выкананьня заданьняў па збожжазагатоўках у аднаасобным сэктары. Даволі прывесьці прыклад з **Глускага** раёну, дзе паасобныя ўпаўнаважаныя РК КП(б)Б па сельсаветах, замест разгортваньня шырокай масава-палітычнай работы сярод аднаасобнікаў, дапусьцілі яўна-«лявацкія» загібы, ужываючы сыстэматычныя вобыскі («пошукі збожжа») ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках і... арышты камісій садзейнасьці збожжазагатоўкам. Дзейнасьць «левых» загібшчыкаў з Глускага раёну зьяўляецца дзейнасьцю кулацкай агентуры, стаўкай клясавага ворага па зрыў загатовак.

«Левыя» загібы жывяць правую практыку. Побач з падменай масавай работы сярод аднаасобнікаў грубым адміністраваньнем, у некаторых раёнах мае месца маховая правапартуністычная практыка, якая выяўляецца ў прэмірэнчых адносінах да кулацка-заможных элементаў, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Замест таго, каб прычынуць да суровай адказнасьці кулакоў — сабатажнікаў здачы збожжа дзяржаве, прымусіць іх поўнасьцю і неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні, паасобныя арганізацыі і сельсаветы «не бачаць кулака», сьцьвярджаюць, што «на нашай тэрыторыі кулакоў няма».

Адзіным адказам партыі па гэтыя агідныя скрыўленьні яе палітыкі ў збожжазагатоўках можа быць толькі **руйнуючы адпор** канкрэтным посьбітам зла — правым і «левым» апартуністам — гэтай агентуры кулацтва.

Памольны збор — адна з важнейшых частак збожжазагатовак. Удзельная вага яго ў агульным пляне складае 36,1 проц. Між тым тэмпы выкананьня пляну гарыца больш чым незадавальняючыя. На 20-га сьнежня плян памольнага збору выканан толькі на 43,4 проц., а па значнай частцы раёнаў (Вушацкім, Чашніцкім, Бятомльскім, Мсьціслаўскім, Лоеўскім і іншых) гэты процант зусім мізэрны (ад 1 да 20).

Мала таго, у радзе месц наглядаецца драпежніцкае разбазарваньне гарыца, незаконнае расходваньне яго па месьніцкіх, рвацкія патрэбы. Неабходна зараз-жа дабіцца карэннага пералому ў ходзе памольнага збору. Трэба бязьлітасна ўдарыць па спробах ашукаць дзяржаву, скарыстаць памольны збор для месьніцкіх патрэб. Тут павінны сказаць сваё рэзкае слова органы ЦКК РСІ і Наркамснабу, якім аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б даручыў «узмацніць барацьбу супроць разбазарваньня памольнага збору, прыняўшы рашучыя меры аж да прыцягненьня да партыйнай і судовай адказнасьці асоб, вінаватых у гэтым».

Мы знаходзімся на самым адказным, рашаючым этапе збожжазагатовак. Гэта абавязвае ўсе партыйныя, савецкія, прафесыянальныя і загатоўчыя арганізацыі да напружаньня ўсіх сіл і сродкаў, да мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на барацьбу за пасьпяховае завяршэньне кампаніі. Трэба памятаць, што па выніках гэтай кампаніі ў тым ці іншым раёне, у тым ці іншым сэктары, партыя будзе судзіць аб баяздольнасьці тэй ці іншай арганізацыі ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

Раённым партыйным канфэрэнцыям пры ацэнцы дзейнасьці партыйных камітэтаў неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на тое, як апошнія забясьпечылі выкананьне пляну збожжазагатовак. Партыйныя сэкрэтары і канфэрэнцыі адстаючых раёнаў павінны забясьпечыць арганізацыю масавага нагляду за збожжа. Канфэрэнцыі павінны змагацца за тое, каб у сваіх пастановах адзначыць перамогу на збожжазагатоўчым вучастку.

ІЛЬНАЗАВОДАМ—ПОЎНУЮ НАГРУЗКУ!

Загатоўкі трасты скончыць у бліжэйшыя дні

Заводы павінны працаваць без перабояў

У БССР дагэтуль працавала 3 ільназаводы. Зараз пушчаны 4 новых. У бліжэйшы час уступаюць у строй яшчэ 42 заводы. Гэта вялізарнай важнасьці факт. Сацыялістычнае ільнакапапляводзтва атрымлівае магутную тэхнічную базу. Задача партыйных арганізацый, на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна, забясьпечыць бесьперабойную работу гэтых заводаў.

Асноўная колькасьць заводаў сыр'ём забясьпечана. Плян загатовак ільнатрасты выканан на 82,2 проц. Горш з ільнасаломкай. Тут плян выканан толькі на 48,5 проц. Недавыкананьне ідзе галоўным чынам за лік саўгасаў, у якіх ня скончан абмалот галовак. Білільнакапапляводтрэст не забясьпечыў своечасовага правядзеньня гэтай работы, у выніку чаго заводы пры ільнаводчых саўгасах асаблівa ў Боркавічах ня маюць выстарчальнай колькасьці сыр'ю.

Трэба прыняць усе меры, каб агэс галовак быў скончаны ў бліжэйшыя дні, а ільнасаломка здана заводам.

Урокі Шклоўчыны, дзе лён быў разасланы з галоўкамі і прарос, а таму датэрмінова зьнят са сьцелішчаў, — павінны быць улічаны ўсімі ільнаводчымі раёнамі. Недалежаны лён нігодны для заводзкой перапрацоўкі, а пры апрацоўцы ўручную таксама дае зусім нізкакачасную прадукцыю. Гэта трэба ўлічваць.

Наркамснаб і Наркамзем БССР дазволілі Шклоўскаму заводу правесьці загатоўкі трасты ў бліжэйшых раёнах — Бялыніцкім, Магілеўскім, Горацкім, Талочынскім і Аршанскім. Задача раённых арганізацый Шклоўскага раёну дапамагчы заводу ў правядзеньні загатовак.

Загатоўку трасты трэба ў баявым парадку закончыць. **Ільназаводы павінны працаваць без перабояў.**

Бракерм—цьвёрдыя стандарты трасты

УВАРАВІЧЫ. Калгасы Ўваравіцкага раёну пацінны здаць ільназаводу 450 тон турбінай (высокаякаснай) трасты. Заданьне выконваецца марудна: зданы ўсяго 94 тоны.

Адзін з прычын слабога разгортваньня загатовак зьяўляецца блытаніна, якую дапускаюць бракеры пры сартаваньні ільнатрасты.

Характэрны прыклад: у калгас імя Варашылава спачатку прыехаў бракер райспажыўсаюзу для сартаваньня трасты. Ён заключыў, што ўся траста для ільназаводу нягодная і павінна быць пераапрацавана незаводзкім парадкам.

Праз некаторы час прыехаў бракер ільназаводу і знайшоў, што траста для заводу падыходзіць. Калгас, нарэшце, ня ведае, якому бракеру верыць.

15 сьнежня калгас імя Энгельса прывёз на завод 6 вазоў добрага ільну, але яго не прынялі. Фурманкі вярнуліся назад за 20 кілёмэтраў.

Такія безадказныя і бескантрольныя паводзіны загатоўчага апарату, якія дэзарганізуюць загатоўкі, ня могуць застацца без пакараньня.

А. Казіміраў.

Шклоўскі райза злажыў зброю

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Шклоўскі ільназавод імя Сталіна ў гэтым годзе павінен атрымаць ад калгасаў 31.280 цэнт. трасты, 1.800 цэнт. ільнасаломы і ад аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак — 5.200 цэнт. трасты. Тэрміны здачы прайшлі. Плян загатовак выканан на 23,7 проц. па трасьце і на 18,2 проц. па ільнасаломе. У выніку гэтага завод увесь час знаходзіцца пад нагрозай спыненьня работы. Запас прадукцыі для перапрацоўкі ўвесь час не перавышае 2-5 дзён.

Райза і райкалгассаюз не павінны забываць, што яны **ў першую чаргу** абавязаны арганізаваць перапрацоўку і загатоўку ільну.

Асноўная-ж прычына незабясьпечанасьці ільназаводу трастой у тым, што амаль па ўсім раёне лён са сьцелішчаў быў падняты раней часу, гэта значыць недалежаны. Віна ў гэтым у першую чаргу райза і райкалгассаюзу, якія яшчэ пры расьціле дапусьцілі трубую памылку: лён расьцілаўся з галоўкамі, на сьцелішчах прарос, а таму быў падняты датэрміново.

Замест дачаснага сьвяткаваньня перамогі, райза і райкалгассаюз і ўсе раённыя арганізацыі павінны змагацца за выпраўленьне дапушчанай памылкі. Абмалот галовак павінен быць скончан неадкладна. Лён, які не даляжаўся, павінен быць разасланы на зімовую адлежку па сьнезе, згодна агранамічных указаньняў. Гэта ні ў якой меры не аслабяне раённыя арганізацыі ад поўнага забясьпячэньня ільназаводу трастой высокай якасьці.

За прастой ільназаводу нясе адказнасьць ня толькі адміністрацыя заводу, але і раённыя арганізацыі, якія не змаглі забясьпечыць завод сырцом.

Ян. Новікаў.

Уступілі у строй новыя чатыры ільназаводы

Згодна тэлеграфных паведамленьняў у Белільнакапапляводбуд, Крупскі, Горацкі,(паўночны) і Ветрынскі і Копыскі ільназаводы скончаны будаўніцтвам. 22-га і 23-га сьнежня зроблен пробны пуск.

Першыя два заводы ўступаюць у работу без дэфектаў. На апошніх двух турбіны патрабуюць незначнай перабоўкі, якая будзе праведзена ў бліжэйшыя дні.

Статут с.-г. арцелі—абавязковы для ўсіх калгасьнікаў

Абагульненьне асноўных сродкаў вытворчасьці павінна адбывацца адначасова з уступленьнем у калгас

ПЕРШАЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА

Лістападаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што «сапраўдны пераход да буйной аграмаджанай гаспадаркі пачынаецца з моманту аграмаджаньня прадугледжаных статутам сродкаў вытворчасьці, што выкананьне чацьвертага пункту статуту сельска-гаспадарчай арцелі зьяўляецца ад нэй з першачарговых задач у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Там, дзе асноўныя сродкі вытворчасьці не аграмаджаны фактычна няма калгасаў, няма сапраўднай калектывізацыі, а ёсьць пагоня за процантамі, за голымі лічбамі.

Па БССР за час з 1-га чэрвеня па 1-га сьнежня ўступіла ў калгасы каля 20 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак, арганізавалася шмат новых калгасаў. Між тым, пэўная колькасьць, як калгасаў у цэлым, так і паасобных калгасьнікаў сродкі вытворчасьці не аграмадзілі. Так, па Капыльскім раёне са 163 калгасаў сродкі вытворчасьці не аграмаджаны ў 23, па Крупскім—з 240 у 70. Тое самае ва Ўваравіцкім, Буда-Кашалёўскім і іншых раёнах Беларусі. Гэта сьведчыць аб тым, што рад райарганізацый ушчыльную не падышлі да практычнага вырашэньня цэнтральнай задачы—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня існуючых калгасаў.

Кулакі, якія пралезьлі ў калгасы, імкнуцца сарваць аграмаджаньне, зрываюць выкананьне статуту с. г. арцелі. Тыя раённыя арганізацыі, якія не мабілізуюць мас калгасьнікаў на правядзеньне работы па аграмаджаньні сродкаў вытворчасьці, згодна статуту, фактычна дапамагаюць кулаку, праяўляюць права-апартуністычную практыку.

Нельга прайсьці міма фактаў фармальнага падыходу пры ажыцьцяўленьні 4-га пункту статуту сельгасарцелі. У радзе месц праводзіцца аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці, без ацэнкі маемасьці, не залічваецца адпаведная колькасьць у непадзельны фонд калгасу і палявы ўзнос калгасьніка.

Пры ўступленьні кожнага бедняка і сераднякa трэба патрабаваць ад яго поўнага выкананьня ўсіх пунктаў статуту арцелі. Асабліва трэба напомніць аб 17 пункце, у якім гаворыцца, што «безгаспадарчыя і нядобрасумленныя адносіны да аграмаджанага інвэнтару і жывёлы разглядаюцца арцелью як здрада справе калектывізацыі, як фактычная дапамога ворагу-кулаку».

Работа партарганізацыі па аграмаджаньні сродкаў вытворчасьці ў калгасах і іх раньняпальнага выкарыстаньня павінна зьвяцца адзэй з пер ліку першачарговых задач у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, у падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны.

70 калгасаў не абагулілі сродкаў вытворчасьці

КРУПКІ. (Наш спец. кар.). У першых лічбах ліпеня на раёне было калектывізавана 20 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Зараз у калгасах аб'яднана 57 проц.

Здавалася-б, што дасягнуўшы значных колькасных паказальнікаў, райком КП(б)Б павінен быў перабудаваць сваю работу ў напрамку выкананьня цэнтральнай задачы — арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці.

Аднак, на справе мы наглядаем зусім іншае зьявішча. Нагнаўшыся за процантамі, раённыя арганізацыі ігнаруюць цэнтральную задачу. На сёнешні дзень у раёне з 240 калгасаў, у 70 яшчэ зусім не аграмаджаны асноўныя сродкі вытворчасьці. Старшыні некаторых калгасаў («Чырвоны май», «Новая вача») пад уплывам кулакоў самі актыўна выступаюць супроць аграмаджаньня.

Райкалгассаюз не праводзіць ніякай масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў аб разгортваньні будаўніцтва і прыстасаваньні адпаведных памяшканьняў, у якіх можна паставіць аграмаджаную маемасьць. Інструктарскі апарат райкалгассаюзу не скарыстоўваецца для правядзеньня работы па аграмаджаньні. Значная колькасьць інструктароў замест выездаў на месцы, сядзіць у канцылярыях РКС і нічога ня робіць.

Райкому КП(б)Б трэба зараз-жа распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў раёну, паставіўшы першачарговай задачай аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці ў новаарганізаваных калгасах.

БАРЫСЕВІЧ.

Ачысьціць калгасы ад кляса-ва-варожых элемэнтаў

ВЕТКА. (БЕЛТА). Мы ўжо ня раз сыгналізавалі аб засьмечанасьці некаторых калгасаў Веткаўскага раёну кулацкім элемэнтам. Між тым раённыя арганізацыі пакуль што ня ўжылі ніякіх захадаў для ачысткі калгасаў ад кулакоў, якія пралезьлі ў калгасы і вядуць шалёную работу па разбурэньні калгаснай вытворчасьці з сярэдзіны.

У калгасе «Гарадок» былыя гандляры і лесапрамыслоўцы (Грамыка І., Бульбенка А., Грамыка В. і Грамыка Ф.) прывялі гаспадарку да заняпаду. Кулацка-заможныя элемэнты ў калгасе «Энэргія» зрываюць выкананьне статуту па аграмаджаньні сродкаў вытворчасьці.

У калгасе «Прасьвет» ёсьць паваг пазбаўленыя выбарчых правоў. Ня лепшае становішча ў калгасе «Рэвучільны».

Коняй аграмадзілі, але не аграмадзілі кармоў

У калгас «Камінтэрн» Будалюшаўскага сельсавету са жніўня месяца ўлілося 27 гаспадарак. Новаўступіўшыя калгасьнікі коняй аграмадзілі, а кармоў на ўтрыманьне гэтых коняй не аграмадзілі. Гэта зьяўляецца нічым іншым, як вынікам кулацкай агітацыі, якая накіравана на разбурэньне калгаснай вытворчасьці. Таксама большасьць гэтых гаспадарак па ўнесьлі насенных і страхавых фондаў.

У той-жа самы час заўважана, што частка заможных гаспадарак разбазарваюць збожжа на прыватным рынку (Кузьмянкоў Фадзей, Самусёў Васіль). Нават загадчык аддзяленьня калгасу «Салтанаўка» ня ўнёс насеннага фонду, а прадае збожжа на прыватным рынку.

У калгасе-ж «Чырвоны пахар» № 2 Ліпінцкага сельсавету праўленьне калгасу ня хоча праводзіць аграмаджаньня коняй калгасьнікаў, спасылаючыся на тое, што ня хопіць сена. Гэта замест таго, каб абагуліць сена і іншыя кармы для ўтрыманьня коняй.

Райкалгассаюз і праўленьні калгасаў павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на поўнае аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці, прадугледжаных статутам с.-г. арцелі. Кулацкія агенты, якія імкнуцца сарваць гэтую работу, павінны атрымаць самы рашучы і бязьлітасны адпор.

Х. і В.

Усесаюзны конкурс нізавога друку

Змагацца за шэсьць умоў тав. Сталіна—важнейшая задача нізавога друку саўгасаў, калгасаў і МТС

РЭЙД КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГІ ПРАВЯДЗЕМ ПАСЬПЯХОВА

У парадку рэалізацыі сацыялістычнага дагавору друку БССР, УССР і Паўночнага Каўказу — **«Зьвязда» і «Рабселькор» з 25 сьнежня да 5-га студзеня праводзяць усебеларускі рэйд цэнтральнага, раённага і нізавога друку па праверцы ажыцьцяўленьня ў калгасах, саўгасах і МТС 6-ці ўмоў тав. Сталіна** (ужываньне зьдзельшчыны і ўвядзеньне праграсыўнай зьдзельшчыны, пастаноўка ўлёку працы, ліквідацыя абязьлічкі і г. д.).

Асноўная **задача рэйду** — праверыць і канкрэтна дапамагчы партарганізацыям і кіраўніцтву саўгасаў, калгасаў і МТС выкрыць усе слабыя вучасткі сваёй работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і намецець канкрэтныя шляхі да іх зьнішчэньня, а таксама абагуліць і перадаць праз друк лепшы вопыт іх работы.

Гэты рэйд павінен прайсьці **пры максымальным удзеле і пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі,** пры шырокім прыцягненьні камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, усіх калгасьнікаў і рабочых саўгасаў і МТС, усіх спэцыялістаў сельскай гаспадаркі. Задачы нізавых газэт, намеціць зараз-жа, сумесна са сваімі партячэйкамі канкрэтны плян рэйду, які вынікае з агульнай праграмы (друкуецца ў «Рабселькоры» № 62).

Асабліва важна самым рашучым чынам змагацца супроць магчымых выпадкаў ператварэньня рэйду ў простым «абсьледаваньні». Паадварот, задача зводзіцца да таго, каб ператварыць рэйд у **масавы паход канкрэтнай дапамогі калгасам, саўгасам і МТС** па ліквідацыі недахопаў, па зьбіраньні творчых сіл, па масавым зборы новых рацыяналізатарскіх прапаноў.

Такая адказная задача ня можа быць выраішана без непасрэднага ўдзелу раённых газэт, якія пад кіраўніцтвам сваіх райкомаў, абавязаны ўпачаліць правядзеньне рэйду праз прыняцьце канкрэтных мер па кіраўніцтву ім (скліканьне інструкцыйных спэцыялізаваных і кустовых нарад і зьлётаў, вопытнае правядзеньне рэйду, рассылка брыгад па дапамозе ў яго правядзеньні і г. д.).

Ня менш адказная задача ўскладаецца і **на цэнтральныя газэты — важкатых калён,** якія праз канкрэтную дапамогу і кіраўніцтва абавязаны забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне рэйду ва ўсіх раёнах сваёй калёны і дабіцца рэальных вынікаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і ў ажыцьцяўленьні 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна.

На першым этапе разгортваньня конкурсу значная частка **нізавых фабрычна-заводзкіх газэт** ужо арганізавала выезды брыгад рабкораў і рабочых у падшэфныя калгасы. Зараз, у сувязі з правядзеньнем рэйду, неабходна арганізаваць паўторныя выезды брыгад фабр.-зав. друку для дапамогі насьценным газэтам калгасаў.

Мы яшчэ раз з асаблівай сілай падкрэсьліваем, што як **конкурс, так і рэйд не зьяўляюцца самамэтай, а толькі сродкам у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

Значэньне рэйду вялізарнае. Яно можа і павінна стаць на сваіх практычных рэзультатах у барацьбе за цэнтральную задачу — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, яшчэ больш значным, калі сам рэйд будзе праведзены з уздымам, пры самым шырокім удзеле работных і калгасных мас.

Такі ўдзел і такія вынікі і павінен забясьпечыць цэнтральныя і раённы нізавы друк, пад кіраўніцтвам сваіх партыйных арганізацый.

Пятнаццаць конкурсных калён вядуць цэнтральныя і гарадзкія газэты БССР

Цэнтральныя газэты БССР, да якіх прымацаваны поўныя раёны для кіраўніцтва імі ў правядзеньні конкурсу нізавых газэт

1-я КАЛЁНА — ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
РАЁНЫ: Бабруйскі, Жыткавіцкі, Горацкі, Клічаўскі Лепельскі, Крупскі, Гарадоцкі, Слуцкі, Лагойскі і Бягомльскі.

II-я КАЛЁНА — ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАБОЧАЯ»
РАЁНЫ: Віцебскі, Жлобінскі, Гомельскі, Барысаўскі, Магілеўскі, Полацкі, Клімавіцкі, Чашніцкі, гор. Менск і раён і ўсе прыгарадныя гаспадаркі гэтых гарадоў.

III-я КАЛЁНА — ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «АКЦЯБР»
РАЁНЫ: Пухавіцкі, Парыцкі, Вушацкі, Мазырскі,, Сенненскі, Вузьдзенскі, Пятрыкоўскі, Крычаўскі і Касьцюковіцкі і нац. калгас імя Х-годзьдзя ў Рэчыцкім раёне.

IV-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ»
РАЁНЫ: Асіповіцкі, Талочынскі, Бярэзінскі, Кармянскі, Стара-Дарожскі, Чырвона-польскі, Дрысенскі, Асьвейскі, Шклоўскі і Грычанскі сельсавет Менскага раёну.

V-ая КАЛЁНА — ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА»
РАЁНЫ: Чэрыкаўскі, Смалявіцкі, Радонскі, Тураўскі, Старобінскі, Бялынічскі, Быхаўскі, Прапойскі і Ельскі.

VI-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «ОРКА»
РАЁНЫ: Нараўлянскі, Койданаўскі, Плешчаніцкі, Заслаўскі, Капыльскі, Лельчыцкі.

VII-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «СЕЛЬГАСРАБОЧЫ БЕЛАРУСІ»
РАЁНЫ: Чырвона-Слабодзкі, Аршанскі, Хойніцкі, Рагачоўскі.

VIII-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАЎДОНАНІС АРТОЯС»
РАЁНЫ: Мсьціслаўскі, Чавускі.

IX-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА»
РАЁНЫ: Церахаўскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Ўваравіцкі.

X-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ»
РАЁНЫ: Бешанковіцкі, Сіроцінскі і Лёзьнянскі.

XI-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РЭЧЫЦКАЯ ПРАЎДА»
РАЁНЫ: Лоеўскі, Брагінскі, Камарынскі.

XII-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАДЫЁ - РАБОЧАЯ ГАЗЭТА»
РАЁНЫ: Рэчыцкі, Дубровенскі.

XIII-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАДЫЁ-КАЛГАСНАЯ»
РАЁНЫ: Чэрвеньскі, Любаньскі.

XIV-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАДЫЁ-ЯЎРЭЙСКАЯ»
РАЁНЫ: Сураскі.

XV-ая КАЛЁНА—ВЯДЗЕ ГАЗЭТА «РАДЫЁ-КАМСАМОЛЬСКАЯ»
РАЁНЫ: Чачэрскі і Глускі.

Першаму ўсебеларускаму зьезду Аўтадора

Прывітаньне сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Задача зьезду таварыства «Аўтадор» заключаецца ў тым, каб пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК арганізаваць шырокія масы працоўных, у першую чаргу аўтадораўцаў, на барацьбу за рацыянальнае выкарыстаньне аўтамабільнага і трактарнага парку, за разгорнутае будаўніцтва новых грунтавых і шасовых дарог.

Для таго, каб з посьпехам ажыцьцявіць гэтыя задачы, Аўтадор павінен шырока разгарнуць арганізацыю сваіх ячэек ня толькі ў горадзе — на фабрыках, заводах і ва ўстановах, дзе ёсьць ужо значныя дасягненьні, але і ў калгасах, саўгасах і МТС, ператварыўшы іх у актыўных барацьбітоў за сацыялістычную рэканструкцыю дарожнай гаспадаркі. У гэтым цяпер асноўная задача Аўтадору. Павярнуцца тварам да дарожнага будаўніцтва, аб'яднаць вакол барацьбы за паляпшэньне і будаўніцтва новых дарог шырокія масы працоўных, падрыхтаваць клясава-сьвядомага вадзіцеля машыны — такая задача, якую практычна павінен вырашыць зьезд.

Няхай жыве КП(б)Б — правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Завод „Бальшавік" перавыконвае праграму

Завод «Бальшавік» за 4-ю пяцідзеўку сьнежня выканаў вытворчую праграму на 103,9 проц. Лепшыя колькасныя паказальнікі дае першы хромавы цэх—107,3 проц. заданьня, на другім месцы—2 хромавы—101 проц.

За 20 дзён сьнежня чырвонасьцяжны «Бальшавік» выканаў 105,8 проц. месячнага пляну.

На 11 дзён раней тэрміну

Рабочыя 2-га і 17-га агрэгатаў **швэйнай фабрыкі імя 8-га сакавіка,** на аснове разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы, перавыканалі на 11 дзён раней

БЯЗ ЖОРСТКАГА ЗМАГАНЬНЯ З УХІЛАМІ У НАЦПЫТАНЬНІ

немагчыма на справе ажыцьцяўляць ЛЕНІНСКУЮ нацпалітыку

За скрыўленьне нацпалітыкі—да партыйнай адказнасьці

Рад партыйных калектываў віцебскай арганізацыі да гэтага часу не дабіліся крутога пералому ў рэалізацыі дырэктыў партыі аб ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У партыйным калектыве **лесазаводу № 13** значная частка партыйцаў пішча на аўдалада беларускай мовай. Апарат канторы вядзе сваю работу на расійскай мове. Ня гледзячы на пераўвасьць 40 чалавек палякаў і 129 яўрэяў-рабочых, спэцыяльнай работы па іх роднай мове не праводзіцца. Кіраўніцтва парткалектыву з невыстарчальнай рашучасьцю рэагавала на праяўленьні ўхілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму і факты антысэмітызму, якія мелі месца з боку працаўнікоў канторы. Ячэйка зусім не займалася пытаньнем падрыхтоўкі актыву з рабочых беларусаў для гаспадарчай кіруючай работы.

На фабрыцы **«Сьцяг індустрыялізацыі»** каля 70 проц. усяго складу парткалектыву ня ведае беларускай мовы. Пра вывучэньне гісторыі і эканомікі БССР ня прыходзіцца і гаварыць. Парткалектыў ня выканаў дырэктыў пленуму гаркому аб арганізацыі гурткоў беларусазнаўства, не рэалізаваў дырэктыў праверачнай камісіі. Праяўленьні яўрэйскага шавінізму і антысэмітызму на фабрыцы не атрымалі жорсткага адпору.

Ня лепш з ажыцьцяўленьнем ленінскай нацпалітыкі і на **акулярнай** фабрыцы. Праверка выявіла, што пастановы гаркому партыі не знайшлі практычнага праламленьня ў рабоце калектыву.

Шматтыражка фабрыкі за ўвесь час падрукавала аб нацпалітыцы толькі два артыкулы агульнага парадку, не рэагавала на вылазку вялікадзяржаўнага шавініста — бухгальтара фабрыкі **Зялюніна**, які аказваў актыўнае супраціўленьне беларусізацыі. Сакратар цэхкіра'ячэйкі **Шчарбінскі** на агульным сходзе выступіў з яўна вялікадзяржаўніцкай прамовай. Шчарбінскі патрабаваў ад усіх прамоўцаў гаварыць выключна па-расійску. Парткалектыў ня ўдарыў па вылазцы Шчарбінскага.

Дырэктыва гаркому аб разгортваньні працягі становішча беларусізацыі парткалектывам руку ня выканаць. Гэты калектыў на канкрэтных фактах праяўленьняў ухілаў у нацпытаньні не мабілізаваў мас для выразнага ажыцьцяўленьня пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б і пастановы ЦК КП(б)Б аб віцебскай арганізацыі.

Да апошняга часу апарат **ЦРК** і **ЗРК**, асабліва па гандлёвай сетцы і грамадзкім харчаваньні яшчэ ў поўнай меры не беларусізаваны. У краме № 67 выяўлен факт антысэмітызму з боку загадчыка Балтуновіча. Ён злачынна не адпускаў хлеба пайшчыкам-яўрэям.

У школе прафруху з боку члена партыі Сударкіна праяўлен антысэмітызм. Бюро парт'ячэйкі належным чынам не ацаніла гэтага факту, зьнізіла яго палітычна-прынцыповае значэньне.

На аб'яднаным пасяджэньні бюро гаркому і прэзыдыуму ГарКК КП(б)Б пытаньне аб гэтых парткалектывах было прадметам спэцыяльнага абмеркаваньня. Бюро ГК і прэзыдыум ГарКК пастанавілі сакратара парткалектыву лесазаводу № 13 тав. **Керча**, які ня здолеў забясьпечыць рэалізацыю дырэктыў партыі аб нацпытаньні, **зьняць з работы.** Дырэктару заводу тав. **Шапіра** абвешчана **вымова.**

Бюро партыйнага камітэту фабрыкі **«Сьцяг індустрыялізацыі»** пастаўлена **на від.**

За праяўленьне прымірэнчых адносін да ўхілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, **сакратар парткалектыву акулярнай фабрыкі тав. Школьнік зьнят з работы, з забаронай на працягу году займаць адказныя пасады.** Справа аб сакратары цэхпарт'ячэйкі Шчарбінскім перадана на разгляд парткалегіі.

Член партыі **Сударкін** за праяўленьне ўхілу да вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, за антысэмітызм **выключан з партыі.**

Бюро ячэйкі школы прафруху за адсутнасьць жорсткага змаганьня супроць антысэмітызму **распушчана.** Члены бюро атрымалі вымовы.

Разам з гэтым бюро гаркому прапанавала пракурору прыцягнуць да адказнасьці гр-на Балтуновіча за антысэмітызм, і інспэктару працы тав. Гладкову, члену партыі, за тое, што ён не дазволіў зьняць з работы Балтуновіча, абвешчана вымова.

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК рашуча папярэдзілі ўсе партыйныя калектывы і ячэйкі, фракцыі фабзаўмясцкомаў аб поадкладнай праверцы выкананьня раней вынесеных пастаноў аб правядзеньні беларусізацыі і абслугоўваньні нацменшасьцей.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Толькі пры афіцыяльных выступленьнях

Савэты актыўных чытуначных клюбаў імя Ільіча і 10-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі не разгортваюць работы па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пры клюбах да гэтага часу не арганізаваны гурткі па вывучэньні беларускай мовы, гісторыі, эканомікі і культуры БССР. Пры савеце клюбу імя Ільіча да гэтага часу няма пляну работы па інтэрнацыянальна-класавым выхаваньні. Пры клюбе ёсьць бібліятэка, якая налічвае звыш 10.000 кніжак, з якіх беларускіх — толькі 0,4 проц.

Яшчэ ў пачатку месячніка праверкі беларусізацыі парткалектыў гэті вынес пастанову арганізаваць пры клюбе гурткі па вывучэньні беларускай мовы, гісторыі і эканомікі Беларусі. Аднак, да сёньняшняга дня гэта пастанова ня выкана. Кіраўнікамі клюбу беларуская мова ўжываецца толькі ў часе афіцыяльных выступленьняў.

Брыгада «Зьвязды».

Улічыць урокі „Камунара“

(з пастановы Менгаркому КП(б)Б і прэзыдыуму ГарКК аб вылазцы вялікадзяржаўнага шавінізму і контр-рэвалюцыйнага антысэмітызму на заводзе „Камунар“)

XVI партыйны зьезд, даючы ацэнку ўсім ухілам ад ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, з усёй яснасьцю і рашучасьцю падкрэсьліў, што галоўную небясьпеку на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны ўхіл, які імкнецца рэвізаваць асновы ленінскай нацыянальнай палітыкі пад сьцягам інтэрнацыяналізму, прыкрываючы імкненьне аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі зьвярнуць сабе страчаныя пры вілеі.

Усякае аслабленьне ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі выклікае ажыўленьне варожых нам элемэнтаў, якія скарыстоўваюць для гэтага адсталую частку рабочых і менш вытрыманую частку членаў партыі, што яшчэ не загартаваліся ў рэвалюцыйнай барацьбе з клясавым вогагам, за дыктатуру пралетарыяту, у барацьбе з ухіламі ў бок шавінізмаў. Таму разгортваньне работы па інтэрнацыянальным выхаваньні мас, бязьлітасная барацьба з кашкрэтнымі ўхілістамі ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам шавінізмамі ўсіх колераў і прымірэнцтвам да іх зьяўляецца важнейшай задачай партарганізацыі.

Партыйнае кіраўніцтва заводу **«Камунар»** сваёй практычнай работай не забясьпечыла поўнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў нацыянальным пытаньні. Пасьля правядзеньня месячніка беларусізацыі нічога практычнага ня зроблена, дасягнутыя вынікі не замацаваны. Гэтым у вядомай меры тлумачыцца антынацыянальная, клясава-варожая дзейнасьць на працягу доўгага часу вялікадзяржаўніка і антысэміта—члена партыі **Піткевіча**, якому ўдалося згуртаваць вакол сябе яшчэ некаторых членаў партыі **(Крук, Кульбакаў, Шчакалаў, Сталяроў).**

Піткевіч у паданай ім заяве яркa адлюстраваў тэндэнцыю вялікадзяржаўнага шавініста, разважаючы:

«Чым можна вытлумачыць тое, што не скарыстаны старыя бальшавікі (рускія) ні на якіх гаспадарча-палітычных і кіруючых работах. Таму, што адчуваюць да іх нацыянальную варожасьць і не дапускаюць да кіраўніцтва заводам. Я нарадзіўся рускім чалавекам і траіў на завод «Камунар». Для аднэй нацыі сродкаў не шкадуюць для яе выхаваньня і вучобы, а другая нацыя (рускія) ня варта гэтых сродкаў».

Бюро ячэйкі такарнага цэху, недаацэніўшы палітычнай шкодлівасьці заявы Піткевіча, ня ўзьняло гэта пытаньне на адпаведную палітычную вышыню, не дало рашучага бальшавіцкага адпору яго антыпартыйным выступленьням. Паасобныя члены бюро ячэйкі **(Кульбакоў),** член ячэйкі **(Сталяроў)** і асабліва сакратар ячэйкі тав. **Крук** і член прэзыдыуму ГарКК (член бюро гэтай ячэйкі) тав. **Шчакалаў,** стаўшы на шлях прымірэнчых адносін да праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму ў радох партыі і контррэвалюцыйнага антысэмітызму ў цэху, рашуча не рэагавалі на антыпартыйныя выступленьні Піткевіча.

Бюро партыйнага калектыву праявіла недапушчальную палітычную блізарукасьць па выкрыцьці праяўленьняў махровага вялікадзяржаўнага шавінізму і контррэвалюцыйнага антысэмітызму на заводзе, ня ўзьняло гэта пытаньне на належную палітычную вышыню, ня ўжыло рашучых бальшавіцкіх мер у адносінах канкрэтных посьбітаў зла.

Вылазка вялікадзяржаўнага шавінізму і антысэмітызму на заводзе «Камунар» сыгналізуе аб неабходнасьці ўзмацненьня палітычнага выхаваньня ўсёй партыйнай арганізацыі, барацьбы за ідэалёгічную чыстату радоў партыі, барацьбы з ухіламі ад ленінскай лініі партыі ў нацпытаньні і гнілым лібэралізмам, які праяўляецца з боку паасобных членаў партыі.

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК патрабуюць ад усёй партыйнай арганізацыі, улічыўшы ўрокі заводу «Камунар», узьняць на яшчэ большую палітычную вышыню справу добраахвотнага вывучэньня беларускай мовы, гісторыі і эканомікі Беларусі рабочымі прадпрыемствамі.

Бюро ГК і прэзыдыум ГКК асабліва падкрэсьліваюць неабходнасьць забесьпячэньня прыкладнасьці камуністаў на прадпрыемствах у справе беларусізацыі.

Абавязаць усе партыйныя калектывы і ячэйкі КП(б)Б правесьці праверку зьнізу да верху выкананьня дырэктыў партыі па карэнізацыі кіруючых кадраў ў прамысловасьці і ў савецкім апараце.

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК пастанаўляюць: махровага вялікадзяржаўнага шавініста і антысэміта **Піткевіча выключыць з радоў партыі.**

За прымірэнчыя адносіны да праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму і контррэвалюцыйнага антысэмітызму ў такарным цэху, за няздольнасьць па-бальшавіцку ацаніць палітычную шкодлівасьць залвы Піткевіча і нерашучае рэагаваньне на яе—**бюро ячэйкі такарнага цэху распусьціць, сакратару ячэйкі т. Круку абвясьціць вымову.**

Члена прэзыдыуму ГарКК тав. Шчакалава за прымірэнчыя адносіны да праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму і контррэвалюцыйнага антысэмітызму—**вывесьці са складу ГарКК.** Пытаньне гэтае ўнесьці на чарговы пленум ГарКК.

За праяўленьне палітычнай блізару касьці ў справе барацьбы з вылазкамі вялікадзяржаўнага шавінізму на заводзе і няўзьняцьця яе на належную палітычную вышыню, нерэагаваньне на заяву Піткевіча, абвясьціць **вымову ўсяму складу бюро парткалектыву** заводу «Камунар» і **аслабаніць т. Гобэрмана ад абавязкаў сакратара парткалектыву.**

Шавіністы пад аховай гнілога лібэралізму

У часе праверкі беларусізацыі ў **Магілёўскім** пэдінстытуце выяўлены факты вялікадзяржаўнага шавінізму, фактыў актыўнага і пасыўнага супраціўленьня правядзеньню беларусізацыі.

Найбольш пагардлівым адносінамі да беларускай мовы адзначаецца выкладчык **Зыгман.** Усе заняткі ён праводзіць выключна на расійскай мове. Наконт беларускай мовы ў Зыгмана ёсьць свае асаблівыя погляды. Ён заяўляе: **«на беларускую мову я перайсьці не магу, з тэй прычыны, што выкладаю грамадазнаўства».**

Паводле погляду Зыгмана, беларускаю моваю нельга, бачыце, карыстацца для выкладаньня ўсіх дысцыплін, гэта «мужыцкая мова» не падыходзіць да выкладчыка грамадазнаўства. Сутнасьць такой «тэорыі» відавочна. Нежаданьне Зыгмана ўжываць у сваёй рабоце беларускай мовы і яго тлумачэньні прычын гэтага нежаданьня нельга інакш разглядаць, як адзін з відаў праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму.

У гэтых адносінах Зыгман у пэдінстытуце не адзінокі. Выкладчык дыялектмату **Пэўзнэр** таксама ігнаруе дырэктывы партыі аб беларусізацыі. Ня гледзячы на тое, што ён добра ўладае беларускай мовай, усё-ж выкладае пераважна на расійскай мове. За выкладчыкамі, якія ігнаруюць задачу беларусізацыі, ідуць і некаторыя студэнты. (Бутома, Букаціна, Канюшка і інш.).

Асабліва рэзка праяўляе клясава-варожыя погляды шавіністка **Казлова** ў адносінах да нацыянальна-культурнага будаўніцтва. І горш за ўсё, што гэтыя шавіністычныя праяўленьні, актыўнае і пасыўнае супраціўленьне беларусізацыі не сустракаюць належнага адпору з боку партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі інстытуту.

Гэтыя факты клясава-варожых вылазак, факты апартуністычных адносін да беларусізацыі патрабуюць павысіць бальшавіцкую пільнасьць ва ўсёй рабоце парт'ячэйкі пэдінстытуту, узмацніць работу па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі партыі, мабілізуючы масы на бязьлітасную барацьбу супроць ухілаў да вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, нацыянал-апартунізму і шавінізмаў усіх іншых колераў.

Зэльцар.

Да чаго прыводзіць адсутнасьць бальшавіцкай самакрытыкі

У кастрычніку «Зьвязда» сыгналізавала аб наяўнасьці нездаровых зьяўлеьняў у рабоце **партыйнага калектыву мэдінстытуту.** Сутнасьць справы заключаецца ў тым, што бюро парткалектыву агазалася няздольным выразна змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі, не праявіла рашучасьці ў барацьбе з апартуністычнымі і ці ў барацьбе з апартуністычнымі і хвасьлісіцкімі паводзінамі часткі партыйцаў.

Бюро парткалектыву інстытуту для віду работы займалася стварэньнем камісій, прымала пастановы з грознымі фармулёўкамі «ўжыць катэгарычныя захады», але справа ня зрушылася з месца.

У допісу «Аб «прыродных задатках» і ўменьні кіраваць». «Зьвязда» (№ 285 ад 19 кастрычніка) адзначала, што «пастановы бюро парткалектыву аб стварэньні камісіі і «катэгарычных мерах» ператварыліся ў шыльду, за якой хаваўся непадроблены хвасьлізм кіруючай галоўкі партарганізацыі інстытуту».

Пытаньне аб становішчы работы парткалектыву інстытуту абмеркавана зараз на аб'яднаным пасяджэньні бюро **Менскага гаркому КП(б)Б** і прэзыдыуму **ГарКК.** Выяўлен рад фактаў апартуністычнага скажэньня дырэктыў партыі.

Камплектаваньне інстытуту другога набору праходзіла бяз строгага рэгуляваньня сацыяльнага складу і бяз уліку нацпытаньня. Таму ў складзе студэнтаў другога набору ў параўнаньні з першым **зьніжана на** 5,5 проц. колькасьць рабочых; пры ўсіх наборах паступова зьніжаецца колькасьць беларусоў (у наборы мінулага году беларусы складалі 52 проц., у веснавым наборы 1931 году—48 проц. і ў асеньнім наборы—41 проц.).

Партарганізацыя інстытуту не паставіла ў цэнтры ўвагі барацьбу за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію ў выкладаньні дысцыплін. Праграма сацыяльна-эканамічных дысцыплін ў інстытуце скарочана на 50 проц. На гэта недапушчальнае зьнівішча партыйная арганізацыя інстытуту не рэагавала.

У інстытуце мела месца палітычна-шкодная тэндэнцыя — рыхтаваць доктараў выключна лекавых, апартуністычна ігнаравалася задача падрыхтоўкі кадраў у галіне санітарна-прафілактычнай. Шкодныя, але даволі распаўсюджаныя ў сьценах інстытуту, былі разважаньні: «Санітарны доктар — гэта старшы дворнік». Абыякавыя адносіны да такога становішча з боку парткіраўніцтва, хвасьлісіцкія паводзіны часткі партыйцаў прывялі да арганізаванага нявыхалу на заняткі студэнтаў трэцяга курсу санфаку.

Парткіраўніцтва інстытуту праявіла бяспрынцыпнае прымірэнцтва да палітычна-шкодных выступленьняў паасобных камуністаў (Гельман, Шаціла). Апошнія нават зараз знаходзяцца на кіруючай партыйнай і камсамольскай рабоце.

З таго часу, як мэдінстытут падпарадкаван ПК Аховы Здароўя, парткіраўніцтва інстытуту праводзіла, пасутнасьці, антыпартыйную лінію, супроцьставячы інстытут Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя, дамагаючыся «аўтанамізму».

Такое становішча ў інстытуце бюро райкому КП(б)Б і прэзыдыум ГарКК характарызуюць **«наяўнасьцю сямейнасьці, бяспрынцыпнай групоўшчыны і адсутнасьцю разгорнутай крытыкі і самакрытыкі».** Парткіраўніцтва інстытуту **«ня толькі ня стала на шлях простага прызнаньня гэтых палітычных памылак, а наадварот, стала на шлях змазваньня іх...»**

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК пастанавілі **распусьціць бюро парткалектыву** мэдінстытуту за грубае скажэньне дырэктыў партыі і дапушчэньне групоўшчыны і сямейнасьці. За ўзначаленьне і ўдзел у бяспрынцыпнай групоўшчыне **Аліпэру, Літвіну, Зоштэйну** і **Гельфману** абвешчана **суровая вымова з папярэджаньнем. Зевіну** за антыпартыйнае выступленьне па сходзе парткалектыву абвешчана **суровая вымова з папярэджаньнем.** Запрапанавана гаркому ЛКСМБ абнавіць кіраўніцтва камсамольскага калектыву. Пастаўлена пытаньне перад ЦК саюзу мэдсанпрацы аб абнаўленьні прафкіраўніцтва інстытуту.

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК заклікаюць партарганізацыю мэдінстытуту па-бальшавіцку мабілізавацца на ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў, партыі, на барацьбу за перамаганьне групоўшчыны, сямейнасьці на аснове шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі; перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, настойліва змагацца за выхаваньне пралетарскіх кадраў. Побач з гэтым, падкрэсьліваецца задача правільнага скарыстаньня старых навуковых работнікаў і спэцыялістаў, якія добрасумленна працуюць у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва.

Важнейшай задачай у рабоце партарганізацыі мэдінстытуту павінна быць непаслабная барацьба на два фронты — супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левага» апартунізму і прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Неабходна ўзмацніць барацьбу на ідэалёгічным фронце супроць усякіх спроб «працягнуць» шкодныя клясава-варожыя тэорыі ў навуку. Разам з тым бюро гаркому КП(б)Б і прэзыдыум ГарКК вызначылі рад канкрэтных мерапрыемстваў па практычным ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі. Завострана ўвага на задачы ўзмацненьня барацьбы супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў.

Н.

А. Карачун, В. Самуцін, А. Манькоў

Агонь па ухілістах да вялікадзяржаўнага шавінізму

У лютым месяцы бягучага году Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) заслухаў даклад Гомельскага гаркому КП(б)Б аб рабоце арганізацыі. У сваёй пастанове ЦК даў разгорнутую праграму барацьбы партарганізацыі Гомелю за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Адзначаючы невыстарчальныя тэмпы нацыянальна-культурнага будаўніцтва, ЦК УсеКП(б) абавязаў Гомельскі гарком:

«У гадавы тэрмін скончыць у асноўным беларусізацыю партыйнага, савецкага, прафсаюзнага апарату і культурна-бытавых устаноў (школы, бібліятэка, клюб), пераходзячы ў гэтых органах на беларускую мову і рашуча вылучаючы на кіруючую работу падрастаючыя беларускія кадры...

Партарганізацыі павесьці больш рашучую барацьбу з праяўленьнямі вялікарасійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекай у правядзеньні нацпалітыкі партыі (тэорыя «штучнай» беларусізацыі), узмацніўшы ў той-жа час выкрываньне і барацьбу з праяўленьнямі беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама яўрэйскага і польскага нацыянал-шавінізму, выхоўваючы на гэтай барацьбе партарганізацыю і шырокія рабочыя масы ў духу ленінскай нацыянальнай палітыкі».

У практычным ажыцьцяўленьні гэтых дырэктыў ЦК УсеКП(б), гомельская партарганізацыя, бязумоўна, дабілася некаторых посьпехаў. Беларусізацыя апарату некаторых гарадзкіх, адміністрацыйных і гаспадарчых устаноў, правядзеньне ўсеагульнага навучаньня, пашырэньне сеткі школ, тэхнікумаў, адкрыцьцё трох ВНУ, выкрыцьцё праяўленьняў ухілаў у бок вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-шавінізмаў іншых колераў — паказваюць на наяўнасьць пералому ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, які вызначыўся пасьля пастановы ЦК УсеКП(б). Але гэты пералом зусім невыстарчальны.

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б (1930 г.) абавязаў усе партарганізацыі «арганізаваць і стаць на чале ўцягненьня шырокіх рабочых мас у справу культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі». Партыйныя калектывы некаторых прадпрыемстваў і асабліва ўстаноў ня толькі не праявілі бальшавіцкай настойлівасьці ў барацьбе за рэалізацыю гэтай дырэктывы, а ў радзе выпадкаў дапусьцілі прымірэнцкія адносіны да ўхілаў як у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, так беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў. У арганізацыі ня толькі ня ўсе члены партыі ўладалі ведамі беларускай мовы, пралетарскай культуры, гісторыі і эканомікі БССР, але нават значная частка партыйнага актыву (у тым ліку некаторыя члены бюро гаркому) ня ведаюць беларускай мовы.

Работа апаратаў асноўных савецкіх, гаспадарчых і кааперацыйных устаноў і арганізацый пераведзена на беларускую мову. Але гэта беларусізацыя ў большасьці выпадкаў зводзіцца толькі да пераводу перапіскі і работы па абслугоўваньні наведвальнікаў на беларускую мову.

Некалькі канкрэтных фактаў.

Апарат гарсавету лічыцца беларусізаваным. Між тым, яго пленум, прэзыдыум праводзяць работу ў пераважнай частцы на расійскай мове. Па-беларуску пішуцца толькі пратаколы, ды гавораць лічаныя таварышы ў сваіх выступленьнях.

У апараце ЦРК замест таго, каб узьнімаць беларусізацыю на вышэйшую ступень, пайшлі назад. Адзін з аддзелаў (плодагарэтніны) перавёў сваю работу на расійскую мову. Намесьнік загадчыка аддзелу Жораў матывуе гэта тым, што ў часе загатовак назьвычай цяжка весьці работу на беларускай мове. Член праўленьня, Чарнік, наведвальнікаў, які гаварыў па беларуску, прапанаваў зьвяртацца толькі на расійскай мове, у працэсным выпадку ён ня будзе адказваць на пытаньні.

Аналёгічнае становішча і ў Сампрамсаюзе. Там з 144 супрацоўнікаў зьвальняючa ведаюць беларускую мову толькі 68 чалавек. У арцелях (Гомхарчавік, «Каапэрацыйны шлях») нават перапіску вядуць на расійскай мове.

У транспартным спажывецкім таварыстве ня толькі апарат, але і партыйны і камсамольскі калектывы не беларусізавалі сваёй работы. Член праўленьня Зіноўеў, калі да яго зьвяртаюцца на беларускай мове, груба адказвае наведвальніку і патрабуе, каб з ім гаварылі толькі на расійскай мове.

Фармальна пераведзена работа па беларускую мову ў такіх установах, як пошта, кіраўніцтва Аўтатранспарту, клюбаў і інш. І асабліва дрэнна стаіць справа з беларусізацыяй кіруючага апарату чыгуначнага вузла.

Ад вытворчых парткалектываў і ў першую чаргу буйнейшых прадпрыемстваў, партыя мае права патрабаваць узорных прыкладаў у ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Але, на жаль, і рад вытворчых парткалектываў не праявілі належнай настойлівасьці ў ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі і яе сустаўной часткі — беларусізацыі. На Гомсельмашы ў апараце кіраўніцтва фабрыкі працуе больш 100 асоб. Ведаюць беларускую мову толькі 35 проц., дрэнна ведаюць — 40 і зусім ня ведаюць — 25 проц. Кіраўніцтва фармальна пераведзена на беларускую мову.

З 10-га чэрвеня па 10-га ліпеня па Гомелю праводзіўся месячнік генэральнай праверкі становішча беларусізацыі. Ён праведзен фармальна. На працягу месячніка работа па ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі ня ўзьнята на вышэйшую ступень. Партыйныя ячэйкі ня былі мабілізаваны на правядзеньне месячніка, на ўзмацненьне змаганьня з «паўзучымі» ўхіламі і ў першую чаргу з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Нядаўна праводзілася праверка становішча работы па беларусізацыі на Добрускай папяровай фабрыцы «Герой працы». Выяўлена, што ні партыйны камітэт, ні прафсаюзная арганізацыя пытаньнямі нацыянальнай палітыкі партыі ня ставілі на практычнае вырашэньне ва ўмовах фабрыкі. Работа парткому і ўся масавая праца сярод рабочых, за выключэньнем афіцыяльнай перапіскі, праводзіцца на расійскай мове. 50 проц. партыйнага і прафсаюзнага актыву ведаюць беларускую мову, але на ёй не гавораць. Праверачная камісія вымушана была ў сваіх вывадах рэзка паставіць пытаньне аб супраціўленцах беларусізацыі. Вывады праверачнай камісіі абмяркоўваліся на пасяджэньні парткому. Аргаддзел парткому Асятроў і член бюро — дырэктар фабрыкі Юшкоў настойвалі на тым, каб усе абвінавачаньні ў бязьдзейнасьці па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі былі аднесены да мінулага кіраўніцтва. Дайшло да таго, што Асятроў і Юшкоў тут-жа на пасяджэньні парткому скацілася да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, выступілі супроць нацыянальнай палітыкі партыі. Юшкоў літаральна заявіў наступнае: —Я на беларускай мове гаварыць не жадаю і ня буду. Можаце зьнімаць мяне з работы, я яе найду ў другім месцы.

З аналёгічнай заявай выступіў і аргаддзел парткому Асятроў:—Я мовы ня ведаю і вучыць ня буду. Калі вы так настойваеце, дык можаце зьняць мяне з работы і забраць мой партыйны білет.

Аб гэтым факце работнік нацкамісіі інфармаваў гарком КП(б)Б, у прыватнасьці загадчыка аргаддзелу тав. Рубіна. Аднак і да гэтага часу справа гэта ня стала прадметам спэцыяльнага абгаварэньня на гаркоме, Асятроў і Юшкоў ня прыцягнуты да партыйнай адказнасьці. Як інакш, як ні лібэральнымі адносінамі да ўхілістаў ад лініі партыі можна назваць такую маруднасьць у пастаноўцы важнейшага пытаньня.

Малюнак становішча беларусізацыі па Добрускай фабрыцы будзе ня поўным, калі не паказаць на такі момант. Невядома, ці ведаюць гомельскія парторганы аб тым, што ў нацкамісіі ляжыць дакумант такога характару. Кіраўніцтва Добрускай фабрыкі ў спэцыяльнай адносіне № 3050-12 ад 1/XI 1931 г. халайнічае перад нацкамісіяй дазволіць весьці бухгальтэрыю і іншыя справы канторы на расійскай мове.

У лесатэхнічным інстытуце на працягу апошняга году быў рад вылазак вялікадзяржаўніцка - шавіністычнага характару з боку некаторых прафэсароў і студэнтаў. Праф. Касьцяеў праграмы і іх распрацоўку будаваў так, што яўна ігнараваў эканоміку БССР, працягваў вялікадзяржаўны зьмест у выкладаньні. Спасылаючыся на факты і прыклады, ён заўсёды браў былую царскую Расію. У праграмы ня была ўнесена тэма аб лясной гаспадарцы БССР. Прафэсар Бакаеў—член партыі пры выкладаньні дыялектычнага матэрыялізму ўпарта не жадае карыстацца беларускай мовай. У інстытуце справа дайшла да таго, што на мэханічным аддзяленьні канструяваньне акадэмічных брыгад адбылося на нацыянальным прынцыпе.

За апошні пэрыяд у Гомелі было многа праяўленьняў антысэмітызму. Ня будзем спыняцца на кожным канкрэтным факце, скажам толькі, што гэтыя праяўленьні мелі месца на заводзе імя Ланцуцкага, у школе імя Калініна, на торфзаводзе «Шлях да сацыялізму», на чыгунцы, ФЗВ і іншых.

Месячнік беларусізацыі ў чэрвені па сутнасьці сарваны. Але гэта не паслужыла сыгналам для ўзмацненьня работы па мабілізацыі партыйных мас на змаганьне з ажыцьцяўленьнем нацыянальнай палітыкі партыі. Гарком КП(б)Б вынес пастанову аб выніках месячніка. Коратка спынімся на асобных пунктах гэтага дакумэнту.

У другім сваім пункце пастанова канстатуе:

«партчастка савецкіх устаноў па вывучэньні беларускай мовы адстае ад беспартыйных мас. З праверэных 93 партыйцаў, якія працуюць у савецкіх установах, зусім ня ведаюць мовы 13, а ў паасобных выпадках наглядаецца супраціўленьне правядзеньню нацпалітыкі».

Зразумела, што такі пункт не мабілізуе патрэбным чынам партарганізацыю на барацьбу з тымі, хто супраціўляецца ажыцьцяўленьню нацыянальнай палітыкі партыі. Тут не паказаны канкрэтныя вінаватыя, не названы прозьвішчы вялікадзяржаўных ухілістаў.

Ня будзем разьбіраць усяго зьместу гэтай пастановы, пакажам толькі, што гэты дакумант не пасычан палітычна-прынцыповым зьместам і не мабілізуе неабходным чынам партарганізацыю на барацьбу з ухіламі ад лініі партыі ў нацпытаньні. У пастанове няма ні слова аб праяўленьнях шавінізму і антысэмітызму. Ні слова няма аб задачах барацьбы партыйных ячэек супроць галоўнай небясьпекі—ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму. Толькі ў апошнім пункце пастанова аддае даніну барацьбе з ухіламі. У ёй гаворыцца:

«Прапанаваць усім парт'ячэйкам і гаркому камсамолу весьці сыстэматычную работу за поўнае аўладаньне беларускай мовай усімі партыйцамі і ўцягненьнем у справу вывучэньня беларускай мовы беспартыйных рабочых, ПОБАЧ З ГЭТЫМ (падкрэслена намі — брыгада) змагацца з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх масьцей».

Зусім ясна, што без рашучага і бязьлітаснага змаганьня супроць ухілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць мясцовых шавінізмаў ня можа быць і гутаркі аб пасьпяховым правядзеньні нацыянальнай палітыкі. Барацьба супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў павінна праводзіць усю работу па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

З 15-га лістапада нацыянальная камісія праводзіць праверку становішча беларусізацыі.

І на гэты раз вакол праверкі не мабілізавана ўвага партыйных ячэек і рабочых мас. Рад партыйных ячэек ня толькі не дапамагалі ў рабоце праверачных камісій, а падрывалі іх работу. Сакратар камсамольскай ячэйкі аўтатранспарту зусім не зьявіўся на праверку. У ЦРК ухілілася ад праверкі 17 чалавек, сярод іх 4 чал. членаў партыі (Хракоўскі, Крэйнін, Зуб, Яршоў) на чале з сакратаром ячэйкі Глатманам. У Сампрамсаюзе на праверку не зьявілася 26 асоб, сярод іх камуністы Казачкоў і Грайер. У Камунальным аддзеле ад праверкі ўхілілася 16 чал., на чале з камуністамі Гібалевічам, Батоўкіным, Чухатовічам, Айбуцдэрам, Сільчанкам і Бурбанам.

У часе праверкі на Гомсельмашы інжынэр Фэльдман выступіў з адмаўленьнем нацыянальнасьцяй, праявіў пагардлівыя адносіны да беларускай мовы. Там-жа на Гомсельмашы адказ ны выканаўца аддзелу забясьпячэньня Мажарэнка выступіў лёзунг: — Далоў усе нацыянальнасьці, няхай будзе адна нацыя.

На дрэваапрацоўчым камбінаце выяўлен рад супраціўленцаў ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі (Тойбін, Прус, інжынэр Марозаў, Рубенчык, Фэйчін і іншыя).

Газэта «Палеская праўда» правяла вялікую работу па мабілізацыі партыйных ячэек і рабочых мас па рэалізацыю задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Гэта бясспрэчны факт. У ажыцьцяўленьні-ж ленінскай нацыянальнай палітыкі паводзіны газэты нельга інакш кваліфікаваць, як апартуністычную недаацэнку адзін з важнейшых задач партыі. З 10 чэрвеня па 10 ліпеня праводзіўся месячнік праверкі становішча беларусізацыі. Замест таго, каб мабілізаваць масы на яго пасьпяховае правядзеньне, газэта абмяжоўваецца толькі зьмяшчэньнем пастановы гаркому партыі, не дае аб ходзе праверкі ні слова.

Толькі пасьля таго, як ЦК КП(б)Б жорстка ўдарыў па апартуністычнай недаацэнцы нацыянальнага пытаньня з боку Крычаўскай газэты, «Палеская праўда» д

Усесаюзны рэйд—паход за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна

З коранем вытруціць абязьлічку і ўраўнілаўку,

якія тармозяць выкананьне прамфінпляну

Пераймайце вопыт лепшых

Асьвятленьне вынікаў першай усебеларускай канфэрэнцыі гаспадарча-разрахунковых брыгад было-б ня поўным, калі прайсьці міма тых, праўда, нямногіх выступленьняў дэлегатаў з інфармацыяй аб **станоўчым вопыце паасобных брыгад.**

Найбольш яркімі і каштоўнымі былі выступленьні т. т. **Клімовіча** і **Брадоўскага** з Гомсельмашу. Абодва яны на аснове вопыту свайго заводу далі разгорнуты малюнак таго, як павінна быць арганізавана і як павінна працаваць гаспадарча-разрахунковая брыгада.

Перш чым прыступіць да арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад, на Гомсельмашы правялі **растлумачальную работу.** Аб гэтай **абавязковай прадпасылцы** на многіх прадпрыемствах забываюць і прыходзяць у брыгаду з гатовым праектам дагавору — «вось вам, падпішэце». Растлумачальная работа **на аснове 6 умоў тав. Сталіна,** з упорам на 6-ю умову — аб гаспадарчым разрахунку, прапрацоўка пастановы ВСНГ СССР і УсеЦСПС ад 11 верасьня і г. д. — стварылі необходную абстаноўку, калі ня толькі перадавыя ўдарнікі, але **кожны рабочы зразумеў** сутнасьць гаспадарчага разрахунку ў брыгадзе.

Глеба была падрыхтавана. Уцямяўшы «сакрэт» гаспадарчага разрахунку, ударнікі патрабавалі паскорыць заключэньне дагавароў, патрабавалі калькуляцыю кожнай дэталі і пармаваньня выдачы дапаможных матар'ялаў.

Для выкананьня рашаючай часткі работы — для правільнага тэхнічнага ўгрунтаваньня гаспадарча-разрахунковых дагавароў — былі мабілізаваны інжынэрна-тэхнічныя і разрахунковыя работнікі. **У парадку сацспаборніцтва** (гэта важна запомніць) брыгады НР і рахункаводаў узялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па лепшай падрыхтоўцы ўдарных брыгад да пераводу на гаспадарчы разрахунак. (Трэба адзначыць, што і па некаторых іншых прадпрыемствах — заводзе імя Варашылава ў Менску, «Пралетары» ў Гомелі — прымацоўваюць НР да гаспадарча-разрахунковых брыгад, але аб сацспаборніцтве сярод НР на вопыт пытаньні яшчэ ня чуваць).

Калі былі гатовы калькуляцыі паасобных дэталяў, нормы выдачкавань на матар'ялаў, энергіі, інструментаў і г. д., тады былі складзены праекты гаспадарча-разрахунковых дагавароў, прычым на дагаворах відаць, што аўтары ж імкнуліся прадугледзець поўнасьцю ўсё тое, што раніць **пастанова ВСНГ СССР і УсеЦСПС ад 11 верасьня.**

Выразнае і ідэйна-палітычнае фармуляваньне дагавароў дало магчымасьць ударнікам шырока разгарнуць барацьбу за **сустрэчныя абавязацельствы.** Мы ня будзем тут падрабязна на іх спыняцца. Даволі сказаць, што, напрыклад, брыгада калеп у парадку сустрэчнага прапанавала зьменшыць колькасьць рабочых у брыгадзе з 16 да 10, брыгада фармоў пічкаў павялічыла колькасьць махавікоў з 10 да 13 і г. д.

Пасыпаліся **рацыяналізатарскія прапановы.** Адміністрацыі быў прад'яўлен рад дадатковых патрабаваньняў. Гэта зьявілася простым вынікам добрай прапрацоўкі гаспадарча-разрахунковых дагавароў. Перад ударнікамі былі пастаўлены **канкрэтныя мэты** і яны пашлі да іх **самым кароткім шляхам,** зьнішчаючы ўсе перашкоды.

Тады-ж на заводзе нарадзіўся **зьменна-сустрэчны.** Бо гаспадарча-разрахунковы дагавор абавязваў думаць аб прамфінпляне не па месяцах, не па дэкадах, а **штодзенна,** і кожнай зьмене ў паасобку.

Тав. **Брадоўскі** — кіраўнік брыгады кален — расказаў падрабязна, як яго брыгада праводзіць зьменна-сустрэчнае ліквідаваньне.

«Рабочыя штодзенна прыходзяць на некалькі мінут раней. Перад работай брыгадзір робіць маленькую інфармацыю. Рабочыя абмяркоўваюць заданьне на гэты дзень і тут-жа высоўваюць **сустрэчнае.** Заданьне і сустрэчны выпісваюцца на дошцы, што вісіць у цэху. Пасьля работы брыгада зьбіраецца на 5 хвілін, правяраецца, як выконвалася сустрэчнае заданьне і абмяркоўваюцца недахопы сёньняшняга дня».

Брыгада кален раней была на калектыўнай зьдзельшчыне. Перад заключэньнем гаспадарча-разрахунковага дагавору яна перайшла на **індывідуальную зьдзельшчыну.** Улік выпрацоўкі кожнага рабочага вялецца паасобна. Побач з плянавым заданьнем паказваецца фактычная выпрацоўка.

Апрача дошкі ўліку вынікі работы падводзіць **насьценгазэта.** Штодзенна — лічбы і камэнтары. Кароткія, баявыя. Насьценгазэта — самы востры інструмант.

Адна дэталь праходзіць праз некалькі пар рук. Узаемасувязь паміж рабочымі самая цесная. Важна, каб работа ішла бесперапынным патокам, жывым канвэерам, пры тым работа добрая, высока-якасная. Такой работы можна дабіцца **толькі на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва.** Таму ў самой брыгадзе кален паміж **паасобнымі рабочымі заключаюцца каруценьнія дагаворы на сацспаборніцтва,** у большасьці выпадкаў вусныя. Лічбы па дошцы ўліку — лепшы сьведка сур'ёзнасьці гэтых выклікаў.

Бывае, рабочы ня прыходзіць на работу. Прычыны могуць быць розныя: грунтоўныя, нягрунтоўныя. У брыгадзе кожны чалавек на вучоце. І для таго, каб выявіць прычыну няяўкі, брыгада пасьля работы камандыруе сваіх прадстаўнікоў на кватэру прагульшчыка (ці хворага).

Ці трэба дзівіцца, што брыгаду кален ведаюць у Гомелі на многіх іншых прадпрыемствах? Ці трэба дзівіцца, што амаль кожны дзень у цэх прыходзяць ударнікі з іншых заводаў — паглядзець, запытаць, як брыгада кален **Брадоўскага** змагаецца за прамфінплян, за якасьць, за гаспадарча-разрахунковы дагавор.

З 46 вытворчых брыгад на Гомсельмашы 21 былі гаспадарча-разрахунковымі ўжо да 1-ай усебеларускай канфэрэнцыі. Зараз іх павінна быць больш. Ці ня гэтым таксама тлумачанца посьпехі, што мае Гомсельмаш за апошнія месяцы ў выкананьні прамфінпляну? (Праграма за кастрычнік-лістапад выканана на 98,1 проц.). Толькі энтузіязм ударнікаў, памножаны на сацыялістычны гаспадарчы разрахунак, пад правільным кіраўніцтвам партыі, можа даць перамогу. І гэтай перамогі дабіўся Гомсельмаш.

***

Вынікі работы першай усебеларускай канфэрэнцыі гаспадарча-разрахунковых брыгад зьяўляюцца **канцэнтраваным** вопытам усіх брыгад. Што карыснага ўнесьлі іншыя прадпрыемствы?

На заводзе **«Бальшавік»** (Менск) быў праведзен **зьлёт гаспадарча-разрахунковых брыгад.** Брыгадзіры зрабілі справаздачы аб сваёй рабоце, указалі на дасягненьні, недахопы. Гаспадарча-разрахунковая брыгада набіўшчыкаў 1-га хромавага цэху ўзяла на **грамадзкі буксір** брыгаду набіўшчыкаў 2-га хромавага цэху, **паслала ў гэты цэх лепшых ударнікаў,** каб ня толькі расказаць, але і **паказаць,** як трэба лепш працаваць.

На менскай **абутковай фабрыцы** на гаспадарчы разрахунак адной з першых перайшла камсамольская брыгада закройшчыкаў. За паўтара месяца брыгада з'эканоміла 19 тыс. дэцымэтраў хрому. Гэта дае магчымасьць выкраіць лішніх некалькі соцень пар абутку. На жаль, тав. **Гольдблат** нічога не расказаў аб **мэтадах** работы брыгады. Але тое, што брыгада штодзенна атрымлівае **фізкультурную зарадку** (пры 100-проц. наведваньні), зьяўляецца **пэўнага** каштоўным укладам у скарбніцу форм і мэтадаў работы гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Скарбніца гэта адкрыта для ўсіх ударнікаў. Пераймайце-ж вопыт лепшых! Вучэнцеся, як трэба перамагаць у барацьбе за прамфінплян, за пяцігодку! І перамагайце!

УЛІК ЭФЭКТЫЎНАСЬЦІ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ НЕ НАЛАДЖАН

«...І так, укараніць і ўмацаваць гаспадарчы разрахунак, узьняць унутры - прамысловыя накапленьні — такава задача». (СТАЛІН).

У галіне рэалізацыі гэтай умовы тав. Сталіна на заводзе «Камунар» ёсьць пэўны зрух. Заключаны дагаворы паміж цэхамі і гаспадарча-матар'яльнай часткай заводу. Арганізаваны самастойныя цэхавыя бухгальтэрыі. Ажыцьцяўляецца кантроль рублём. Так, мэханічны цэх прад'явіў ліцейнаму за парушэньне ўмовы аб якасьці чыгуна наступныя рахункі: у ліпені—на 2 200 руб., у жніўні—на 989 руб., у верасьні — на 1.201 руб. Кавальны цэх за несвоечасовую дастаўку дэталяй прад'явіў рахунак мэханічнаму цэху на 128 руб. Бляшаны цэх патрабаваў ад гаспадарча-матар'яльнай часткі ўплаты 2855 руб. за перабої ў дастаўцы матар'ялаў.

Аднак, гэтыя зрухі зусім **невыстарчальныя.** Хоць цэхі маюць самастойную бухгальтэрыю, але **ўлік эфэктыўнасьці ад пераходу на гаспадарчы разрахунак не наладжан.** Дагэтуль ёсьць рад фактаў, калі цэхі парушаюць узятыя на сябе па дагаворах абавязкі. Гэта тлумачыцца тым, што цэхавая адміністрацыя лічыць, што кантроль рублём трэба праводзіць толькі пры наяўнасьці вялікіх прастояў па віне таго ці іншага цэху.

На гаспадарчы разрахунак перайшло толькі 7 брыгад, але іх работа мала чым адрозьніваецца ад работы звычайных брыгад.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады ўстанавілі нормы затраты рабочай сілы па выпрацоўку тэй ці іншай дэталі, або машыны. Аднак няма норм расходваньня асноўных і дапаможных матар'ялаў. Брыгады ня ведаюць, колькі матар'ялаў яны павінны расходваць, каб выпусьціць адзінку прадукцыі. У такарным аддзяленьні мэханічнага цэху на гаспадарчы разрахунак перайшлі два страгальныя варштаты. Падпісаны дагаворы з цэхавай адміністрацыяй, але варштаты дагэтуль працуюць па-старому. Досыць прывесьці факт, што брыгады карыстаюцца агульна цэхавым маслам для змазкі. У брыгадзе тав. Дваронцкага варштат, за якім працуе брыгада, за ёй яшчэ нават не замацаваны. Змазку робяць ня самі чалавекі, а цэхавыя змазчыкі. Гэта, у некаторай ступені, параджае абязьлічку.

Самым слабым вучасткам работы гаспадарча-разрахунковых брыгад зьяўляецца ўлік эфэктыўнасьці працы. Некаторыя брыгады перайшлі на новыя мэтады работы больш двух месяцаў назад; на сёньняшні дзень яны нават ня ведаюць, колькі матар'ялаў імі з'эканомлена.

Вось, што расказвае брыгадзір тав. **Турэцкі:** «Мы добра ведаем, што ў нас павінна быць значная эканомія ў рабочай сіле, асноўных і дапаможных матар'ялах, але ня можам дакладна сказаць, колькі мы з'эканомілі, бо ніякага ўліку няма».

У выніку адсутнасьці ўліку брыгады пазбаўлены магчымасьці атрымаць прэміі.

Не наладжан кантроль за ажыцьцяўленьнем дагавароў, якія брыгады заключылі з цэхавай адміністрацыяй. Рабочыя гаспадарча-разрахунковага варштату № 47 па працягу трох тыдняў не атрымлівалі патрэбных ім балтоў, а адміністрацыя цэху ніякіх мер не прыняла.

— Гаспадарчы разрахунак—вельмі карысная справа, — заяўляе брыгадзір гаспадарча-разрахунковай брыгады па зборцы помпаў, **тав. Крыштаню саў,**—але кепска тое, што нашы дагаворы часта застаюцца толькі на паперы. Вось, напрыклад, у нашай брыгадзе з-за несвоечасовай падачы дэталяй — адзін рабочы на працягу цэлага месяца ня меў нагрузкі.

У радзе брыгад існуе ўраўнілаўка ў зарплаце.

У чым прычыны нездавальняючага становішча з укараненьнем гаспадарчага разрахунку?

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі заводу дагэтуль яшчэ не аддалі належнай увагі правядзеньню гаспадарчага разрахунку, праявілі фармальны падыход да гэтай справы. Дагаворы не прапрацаваны, як належыць. У некаторых брыгадах ня ўсе члены ведаюць абавязкі, узятыя на сябе па дагаворах.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі заводу «Камунар» павінны павярнуцца тварам да гаспадарчага разрахунку.

Менскія ўдарнікі «Правды», «Зьвязды» і «Камунараўца». Валодзін, Бачыла, Турэцкі, Мінкевіч, Ахрэмчык, Фралоў, Зямчонак, Шыфрына, Караеў, Насілоўскі, Шчурвіч, Шандаровіч і Хаймоўскі.

ПАСКАРЭНЬНЕ ТАВАРАЗВАРОТУ—ВУЗЛАВАЯ ЗАДАЧА САВЕЦКАГА ГАНДЛЮ

Не парушаць лімітаў

Дырэктыва партыі і ўраду аб паскарэньні таваразвароту і максымальным скарачэньні таварных астач выконваюцца сыстэмай спажывецкай кааперацыі БССР з выключнай марудпасьцю.

Затаварваньне мае месца амаль па ўсіх зьвеньнях кааперацыі, асабліва па лясной, тарфяной сэкцыях і раздробных аб'яднаньнях БКС.

Паасобныя зьвеньні спажыўкааперацыі праяўляюць апартуністычную недаацэнку разгортваньня савецкага гандлю і ня прымаюць рашучых мер для хутчэйшага прасоўваньня тавараў да спажыўца.

Белкаапсаюз бюракратычна адносіцца да справы затаварваньня. На 1 кастрычніка таварныя астачы замест 22.294.000 р., складалі 29.807.000 руб., на 1 лістапада адпаведна — 22.867.000 і 27.591 тыс. руб. На 1 сьнежня астачы тавараў засталіся стабільнымі.

Прафэсыянальныя арганізацыі не аддаюць выстарчальнай увагі мабілізацыі грамадзкасьці і арганізацыі шырокага рабочага кантролю для праверкі выкананьня дырэктыў па таваразвароце і ліквідацыі затаварваньня.

Абураючыя факты залежаў тавараў сьведчаць аб тым, што ў некаторых кааперацыйных арганізацыях далёка ня зьнішчан «нэпманскі дух» і спэкуляцыйныя тэндэнцыі. Замаруджваньне таваразвароту сьведчыць аб бюракратычным ігнараваньні патрэб спажыўца.

Прэзыдыум ЦСПСБ абавязаў Белкаапсаюз на працягу 10 дзён скараціць таварныя адстачы да вызначаных лімітаў.

Усім гаррайпрафсаветам прапанавана неадкладна ўключыцца ў праверку ўсіх крам і баз кааперацыі і Дзяржгандлю, якая праводзіцца паводле пастановы ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Да суровай адказнасьці!

Бюро парткалектыву Белкаапсаюзу разам з фракцыяй прэзыдыуму БКС намецілі рад мерапрыемстваў па ліквідацыі замарожваньня таваразвароту па складах і ў паасобных аб'яднаньнях, спажыўкааперацыі.

Паводле пастановы парткалектыву і фракцыі БКС тавар па прыбыцьці на склад павінен быць адгружан не пазьней, як праз 3 дні.

Дырэктары ўсіх аб'яднаньняў папярэджаны, што за невыкананьне пастановы аб паскарэньні таваразвароту яны будуць прыцягнуты да самай строгай партыйнай і судовай адказнасьці.

Трэба канстатаваць, што, ня гледзячы на паказаную пастанову, паасобныя зьвеньні спажыўкааперацыі, асабліва дарожная і лясная сэкцыі Белкаапсаюзу, усё яшчэ марудзяць з разгортваньнем савецкага гандлю і ліквідацыяй залежаў тавараў.

21 сьнежня брыгада парткалектыву БКС выкрыла наступнае.

На складах дарожнай сэкцыі аказаліся цёплыя ватныя штаны ў колькасьці 600 пар, якія ляжаць на складзе больш за 18 дзён. 206 піджакоў ляжаць з канца лістапада. Да сёньняшняга дня няма нават разнарадкі, кому адправіць гэты тавар.

215 скрынак гаспадарчага мыла прыбыло па склад 19 сьнежня, разнарадка дана толькі на 115 скрынак. Апошнія яшчэ не адпраўлены.

Больш 10 дзён ляжаць 56 мяшкоў цукру. Разнарадкі няма.

На складзе дарсэкцыі на працягу двух месяцаў ляжаць 450 пар ботаў, 13 скрынак махоркі прыбылі каля 10 дзён таму назад, разнарадкі таксама няма.

Ня лепшы малюнак і на складах лясной сэкцыі. Вагон хустак прыбыў 12 сьнежня, але па віне праўленьня лесасэкцыі поўнасьцю не адпраўлены. Лесарабкопам. Між тым сладзейя работнікі працавалі дзень і ноч, каб падрыхтаваць адпраўку. Праўленьне-ж лесасэкцыі не мабілізавала работнікаў свайго апарату для хутчэйшай адпраўкі гэтых хустак. З 10-го сьнежня ляжаць 8 тыс. банак капсэраў.

17 сьнежня прыбыў вагон гатовага адзеньня на 46 тыс. руб. Тавар не выкуплен лесасэкцыяй. У выніку гатовая вопратка на значную суму замарожана.

Некалькі зварушылася прамтаварнае аб'яднаньне БКС. 18 скрынак гатовай вопраткі, якая прыбыла 21-го сьнежня, адгружана ў той-жа дзень. Адзін вагон вопраткі ня выкуплен аб'яднаньнем з-за адсутнасьці рахункаў. Гомельская фабрыка адправіла без згоды прамтаварнага аб'яднаньня 10 скрынак летніх шапак. Тавар ня выкуплен. Ня гледзячы на запытаньні прамтаварнага аб'яднаньня — кому адправіць тавар, гомельская фабрыка не дала адказу. Тавар ляжыць без усякага руху.

Вінаватыя ў дэзарганізацыі таваразвароту павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці.

КРЫЛАВІЦКІ, НЕГАРАЎ.

Герман, Ільлюшын І., Рохлін С.

СУПРОЦЬ МЕНШАВІЦТВУЮЧАГА ІДЭАЛІЗМУ І МЭХАНІЦЫЗМУ У ФІЛЕЗОФІІ

Тав. Сталін своім лістом у рэдакцыю «Пролетарской революции» мабілізаваў увагу партыі па ўзмацненьне бальшавіцкай пільнасьці ў пытаньнях тэорыі і практыкі ленінізму, для бязьлітаснай барацьбы з праціўнікам контр-рэвалюцыйнай трацкісцкай і розпага роду апартуністычнай кантрабандай. Важнейшай задачай, высунутай лістом тав. Сталіна, зьяўляецца барацьба з гнілым лібэралізмам, які пануе сярод ненатарных членаў партыі, што дае магчымасьць трацкісцкім кантрабандытам і фальсыфікатарам знайсьці месца для сваіх шкодных тэорый на старонках бальшавіцкіх часопісяў і ў паасобных выданьнях.

Выданьне кнігі **Быхаўскага — «Нарысы філёзофіі дыялектычнага матэрыялізму»** на беларускай мове ў 1931 годзе, якая ідзе па лініі меншавіцтвуючага ідэалізму, зьмыкаючыся з устаноўкамі мэханіцызму, ёсьць ярадзьленьне гнілога лібэралізму за кошт кроўных інтарэсаў бальшавізму.

1931 год зьяўляецца годам бліскучых **перамог** партыі як у галіне сацыялістычнай эканомікі, так і на ідэалёгічным фронце. **У гэтым годзе быў** канчаткова **выкрыт меншавіцтвуючы ідэалізм** у філёзофіі, які зьяўляецца ў асноўным мэтадалёгічнай базай трацкізму — перадавога атраду контр-рэвалюцыйнай буржуазіі. Разгром меншавіцтвуючага ідэалізму даў магчымасьць навесьці пасьлядоўную барацьбу супроць **мэханіцызму** — тэарытычнай базы правага ўхілу. Вялікічкая матэрыялісты-дыялектыкі, марксісты-ленінцы пастанілі на першы плян і ўзяліся за распрацоўку пытаньняў, якія сьвядома ігнараваліся меншавіцтвуючымі ідэалістамі, іменна: **пытаньне ленінскага** этапу ў філёзофіі, **партыйнасьці** філёзофіі і на вузі, барацьбы **на два фронты** і інш.

Гэтыя пытаньні, зразумела, у кнізе Быхаўскага адсутнічаюць. «Нарысы» характэрны бытаньні **фармальна-лёгічнымі** разважаньнямі абстрактнасьцямі і **«беспартыйнымі»** ўстаноўкамі, якія прыкрываюць контр-рэвалюцыйную сутнасьць меншавіцтвуючага ідэалізму.

Самае разуменьне Быхаўскім **прадмету філёзофіі** глыбока няправільнае. «Філёзофія, — піша Быхаўскі, — навука аб навуках, аб кожнай навуцы, аб ведах» (стар. 10). «Філёзофія [illegible] сабою дасьледаньне спо сабу пазнаньня вучэньня аб мэтах навукі, які-б ня былі не аб'екты, тэорыі навукі і «тэхналёгіі» пазнаньня» (стар. 11).

Такое азначэньне трэба **скажае** сэнс дыялектычнага матэрыялізму, як філёзофіі пралетарыяту. Для нас прадметам філёзофіі, прадметам матэрыялістычнай дыялектыкі зьяўляюцца **законы разьвіцьця аб'ектыўнай рэчаіснасьці.** Ленін таму ставіў перад філёзофамі задачу **«распрацоўкі тэорыі дыялектыкі, як філёзофскай навукі».**

Для нас матэрыялістычная дыялектыка прадстаўляе **адзінства** сьветапогляду і мэтаду. А па ўсёй кніжцы Быхаўскага праводзіцца **адрыў** мэтадалёгіі ад сьветапогляду. У кніжцы зусім адсутнічае трактоўка марксызму-ленінізму, як **«вопыту рабочага руху ўсіх краін, узятага ў яго агульным выглядзе».**

Значэньне марксызму-ленінізму, як сьветапогляду пралетарыяту, як тэарытычнай зброі ў яго барацьбе супроць экспляататараў, па-ганебнаму, па-злачынаму **замоўчваецца у «Нарысах».**

Разрыў паміж тэорыяй і практыкай, характэрны для меншавіцтвуючых ідэалістаў, даведзен у «Нарысах» Быхаўскага да лёгічнага канца.

Наша сапраўдная філёзофія марксызму-ленінізму ўключае ў сябе тэорыю пралетарскай рэвалюцыі, базуец па на ёй, выходзіць з яе. Філёзофія марксызму-ленінізму непарыўна зьвязана з практыкай рэвалюцыі.

***

Меншавіцтвуючыя ідэалісты, як і мэханісты, ігнаравалі глыбокую думку Леніна аб тым, што **«дыялектыка і ёсьць тэорыя пазнаньня марксызму»** (Ленін, том XIII, стар. 303).

Пляханаў **не зразумеў** сутнасьці гэтай ленінскай установы. Паводле Пляханава марксызм лічыўся тэорыяй пазнаньня матэрыялізму плюс дыялектыка.

У Быхаўскага гэта скажэньне больш наглыблена. Ён імкнецца выкрышць тэорыю пазнаньня на глебе мэханістычнага французскага і фаерба хінскага матэрыялізму.

Аўтар, разглядаючы ролю чалавечай практыкі ў пазнаньні, ня ідзе далей таго, што «чалавек павінен штодні, штогадзіны дапасоўвацца» і «ня толькі павінен дапасоўвацца, але і ўмее дапасоўвацца».

Па-марксыцку, па-ленінску можна выкрышць тэорыю пазнаньня толькі разглядаючы пазнаньне ў працэсе яго **дыялектычнага развіцьця.** Практыка чалавека ёсьць для нас грамадзка-рэвалюцыйная практыка. Ня толькі дапасаваньне да прыроды, але і **актыўная зьмена** сьвету — прыроды і грамадзтва. **Маркс, Энгельс, Ленін** фармулявалі гэта коратка і моцна тэй думкай, што задача заключаецца ня толькі ў тым, каб тлумачыць сьвет, але, галоўным чынам, у тым каб зьмяніць яго.

«Сьвет не здавальняе чалавека, — піша Ленін, — **і чалавек сваім дзеяньнем вырашае яго зьмяніць».**

Тэрыю пазнаньня Быхаўскі разумее па-кантыянску, як пытаньне «магчымасьці навукі» і «магчымасьці пазнаньня».

На самой-жа справы **тэорыя пазнаньня** вырашае пытаньні аб правільнасьці, адэкватнасьці, аб'ектыўнасьці нашых ведаў, г. зн. устанаўленьне, наколькі яны адпавядаюць сапраўдным рэчам. Гэтыя асноўныя пытаньні тэорыі пазнаньня марксызму-ленінізму вырашаюцца ня толькі навуковай практыкай і навукай аб шляхох пазнаньня. Паводле Леніна тэорыю пазнаньня магчыма вырашыць толькі ў непасрэднай сувязі з гісторыяй разьвіцьця чалавечага грамадзтва, тэхнікі і разьвіцьця мысьленьня.

Вырашэньне Леніным праблемы пазнаньня, як **дыялектыкі і лёгікі,** грунтуецца на тым, што рэчаіснае пазнаньне ёсьць **гістарычны працэс** рэвалюцыйнай дзейнасьці грамадзкага чалавека.

Правільнае вырашэньне пытаньня тэорыі пазнаньня прыводзіць нас шчыльна да вываду аб **клясавасьці пазнаньня, аб партыйнасьці і дзейнасьці тэорыі.**

Пагардліва-панскія адносіны да пытаньняў гістарычнага матэрыялізму, тыповыя для меншавіцтвуючых ідэалістаў, характэрны і для Быхаўскага.

***

Пры аналізе грамады, Быхаўскі выходзіць з мэханістычнай бухарынскай тэорыі суадносін прыроды і грамадзтва. Атзначаючы разуменьне грамадзкага жыцьця Быхаўскі піша: «Разуменьне гэта азначае злучанасьць рознастайных узаемаадносін, якія аб'ектыўна складаюцца паміж людзьмі на аснове адносін грамадзтва да прыроды» (стар. 132).

Грамадзкае жыцьцё паводле Быхаўскага азначаецца ўзаемаадносінамі грамадзтва да прыроды; сувязь паміж грамадзтвам і прыродай робіцца асновай грамадзкага быцьця, прычынай унутранога разьвіцьця грамадзтва.

Гэта палажэньне мэханістычнага парадку ідэе наперакор сьцьвярджэньню Маркса аб тым, што «з самага пачатку цывілізацыі ў аснову вытворства кладзецца антаганізм стаўнай, становішча клясаў, нарэшце, антаганізм накопленай працы і жывой» (Маркс «Нищета философии», стар. 52), што вытворчыя сілы ў клясавым грамадзтве да сучаснага моманту разьвіваліся ў выніку панаваньня антаганізму клясаў, у выніку клясавай барацьбы.

Як-жа вырашае тав. Быхаўскі асноўнае пытаньне гістарычнага матэрыялізму, пытаньне аб **адзінстве вытворчых сіл і вытворчых адносін** у іх рэальнай дыялектыцы гістарычнага разьвіцьця?

Тав. Быхаўскі палкам пераймае славутую мэханістычную меншавіцкую пяцічленную формулу Пляханава. Агаворкі тав. Быхаўскага адносна недахопаў усялякай схемы, напрыклад адносна непасрэднага ўплыву базісу па рознага роду надбудовы—не зьмяняюць сутнасьці пляханаўскай формулы.

«Такім чынам, — піша Быхаўскі, — матэрыялістычнае разуменьне гісторыі сьцьвярджае, што ў працэсе змаганьня чалавека з прыродай, у працэсе прапоўнага ўзьдзеяньчаньня на яе грамадзтва складаецца той ці іншы тып вытворчасьці, сутнасьць якое характарызуецца тым, якая яе тэхніка, спосаб вытворчасьці, станам вытворчых сіл грамадзтва, адзначаюц па адносіны людзей у працэсе вытворчасьці, а на падставе гэтых вытворчых адносін паміж людзьмі вакол іх вырастаюць усе іншыя віды адносін паміж людзьмі, уяўленьні, імкненьні і погляды грамадзтва, словам, уся грамадзкая надбудова» (стар. 136).

Атрымліваецца мёртвая, абстрактна-мэханістычная схема, у якой вытворчыя сілы бярэцца абстрактна, негістарычна, адарвана ад пэўнага спосабу грамадзкага вытворства (грамадзка-эканамічнай фармацыі). — як вытворчыя сілы «наогул». Вытворчыя сілы, якія ўтоесамляюцца са спосабам вытворства і зводзяцца да тэхнікі, робяцца базісам, вад якім пасьлядоўна ўсводзяцца выпэйшыя паверхі грамадзкай надбудовы: вытворчыя адносіны, сацыяльна-палітычны лад, псыхіка грамадзкага чалавека і, нарэшце, розныя ідэалёгіі.

Са схэмы Быхаўскага выпадае **клясавая барацьба.** Быхаўскі разглядаючы вытворчыя сілы «наогул», як вытворчыя адносіны «наогул», не разумее таго, што ў клясавым грамадзтве вытворчыя адносіны — ёсьць **клясавыя** адносіны. Быхаўская «дыялектыка» разьвіцьця грамадзтва простай сьцежкай вядзе да пазыцыі буржуазных сацыолёгаў, да адмаўленьня актыўнай ролі рэвалюцыйнай практыкі ў гістарычным працэсе, да адмаўленьня марксыцка-ленінскага сьцьвярджэньня аб тым, што «з усіх прылад вытворства найбольшую вытворчую сілу прадстаўляе сама рэвалюцыйная клясa».

Зусім не выпадкова ў «Нарысах» адсутнічае крытыка бухарынскай тэорыі разьвіцьця грамадзтва, бо сам аўтар падзяляе тэхніцызм, натуралізм Бухарына ў разуменьні вытворчых сіл.

Быхаўскі не ўзьнімаўся да ленінскага разуменьня дыялектычнага адзінства і супярэчнасьці вытворчых сіл і вытворчых адносін, якая выяўляецца ў супярэчнасьці саміх вытворчых адносін, як формы разьвіцьця вытворчых сіл. Быхаўскі зусім абыходзіць дыялектыку вытворчых сіл і вытворчых адносін нашай пераходнай эканомікі. Між тым практыка сацыялістычнага будаўніцтва выразна паказвае, як сацыялістычныя вытворчыя адносіны, якія абумоўліваюць сацыялістычныя формы працы (ударніцтва, сацспаборніцтва, сустрэчныя пляны, брыгады гаспадарчага разрахунку), зьяўляюцца магутнейшай рухомай сілай разьвіцьця вытворчых сіл СССР.

Быхаўскі спочваецца да **ідэалістычнага** разуменьня самой дыялектыкі, як абстрактнай дыялектыкі «наогул», якая раздвойваецца на дзьве роўнапраўныя часткі. «Дыялектыка раздвойваецца на дыялектыку матэрыялістычную і проціслегую ёй — ідэалістычную дыялектыку» (стар. 329). Быхаўскі не разумее, што толькі **матэрыялістычная дыялектыка** ёсьць адзіная сапраўдная дыялектыка разьвіцьця прыроды і грамадзтва.

У адносінах разуменьня асноўнага закону дыялектыкі — **закону проціслегласьці** — Быхаўскі палкам прымае канцэпцыю меншавіцтвуючага ідэалізму. «Проціслегласьць ёсьць разьвіцьцем розьніцы. Пэўная высокая ступень розьніцы ператвараў гэту розьніцу ў проціслегласьць, гэта значыць, неабходнае, істотнае, унутранае — у непрымірымую розьніцу» (стар. 295).

Для Быхаўскага закон адзінства проціслегласьці раскладзен па палічках. Спачатку выступае тоесамасьць, пасьля — розьніца, апошняя пераходзіць у проціслегласьць, а, нарэшце, зьяўляецца супярэчнасьць. Значыць, супярэчнасьць ня можа быць прычынай руху таму, што яна зьяўляецца вынікам, а ня выточным пунктам працэсу.

У рэчаіснасьці-ж супярэчнасьць ёсьць аснова, крыніца ўсякага руху. Без супярэчнасьці няма руху.

Пры ўстаноўцы Быхаўскага ўсякая супярэчнасьць павінна насіць антаганістычны характар і павінна быць вырашана толькі ў канфлікце.

Ленін паконт гэтага кажа наступнае: **«Антаганізм і супярэчнасьць зусім не адно і тое-ж. Першае зьнікне, другое застанецца пры сацыялізьме»** (II Ленінскі зборнік, стар. 357).

Разуменьне супярэчнасьцей, як выключна антаганізму, зьяўляецца мэтадалёгічнай зброяй у руках трацкістаў, каб даказаць намінучасьць канфлікту паміж рабочай клясай і сялянствам, няздольнасьць рабочай клясы перамагчы частковыя, часовыя супярэчнасьці з сялянствам у проціслегласьць палажэньню ленінізму аб тым, што: **«Мы маем, па-першае, агульнасьць інтарэсаў пралетарыяту і сялянству ў перамозе сацыялістычнага шляху разьвіцьця народнай гаспадаркі»** (Сталін «Пытаньні ленінізму» стар. 195).

Але, з другога боку, разуменьне розьніцы, як чыста **знадворнай,** як адносін, якія пазбаўлены супярэчнасьцей, падмена прыродзі Быхаўскага да апартуністычнага разуменьня ўзаемаадносін пралетарыяту з сялянствам, **да адмаўленьня** якіх-бы там ні было супярэчнасьцей паміж імі.

Канцэпцыя меншавіцтвуючага ідэалізму пазбавіла закон адзінства проціслегласьці яго асновы — супярэчнасьці ўсякага разьвіцьця.

Фармальная лёгіка стасуецца да дыялектычнай, па думцы аўтара, як «элементарная матэматыка да вышэйшай», як натуральныя вочы — да мікраскопа і тэлескопа.

Для практыкі выходзіць, дыялектыка не патрэбна, толькі навуковая творчасьць ня можа абыйсьціся без дыялектыкі. Такі погляд, які сьцьвярджае Быхаўскі характэрны для ўсіх меншавіцтвуючых ідэалістаў.

Бальшавізм-жа вучыць, што практыку клясавай барацьбы, практыку будаўніцтва сацыялізму нельга праводзіць без рэвалюцыйнай тэорыі, бяз ленінскай дыялектыкі.

Ленін — **геніяльны дыялектык у тэорыі і ў практыцы** — вучыў нас таму, што за ўсякім простым, звычайным будзённым заключаецца дыялектыка. Самых прасьцейшых зьяваў нельга зразумець без дапасаваньня дыялектычнай лёгікі, без выкрыцьця супярэчнасьцей у самых звычайных фактах.

Быхаўскі, стоячы на пазыцыі меншавіцтвуючага ідэалізму, ня можа весьці барацьбу з варожымі пралетарыяту тэорыямі. Яго філёзофія накіравана на разбройваньне пралетарыяту абстрактнымі ідэалістычнымі «мудрагельствамі», не выкрываючы клясавых карэньняў буржуазных і апартуністычных тэорый. Нават, разглядаючы тэорыю роўнавагі, стрыжнёвы пункт мэтадалёгіі правага ўхілу, якая характарызавана Сталіным як **«тэорыя, што мае аб'ектыўнае сваёй мэтай абараніць пазыцыі індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, узброіць кулацкія элементы новай тэарытычнай зброяй у іх барацьбе з калгасамі і дыскрэдытаваць пазыцыі калгасаў»,** Быхаўскі не знаходзіць нічога іншага, як сказаць: «разнагалосьне мэханістаў і дыялектыкаў — спрэчкі не аб словах, а аб шляхох навукі, а ўсёй устаноўцы навуковай мэтадалёгіі пра шляхі і пэрспэктывы яе, асабліва «прыродазнаўства» (стар. 289).

Вось і ўсё. Для Быхаўскага тэорыя роўнавагі Бухарына, якой аперавалі шкоднікі Громаны і Бесарабцевы у сваіх контр-рэвалюцыйных выступленьнях супроць індустрыялізацыі і калектывізацыі, прадстаўляе нявінныя спрэчкі аб шляхох навукі.

***

«Нарыс дыялектычнага матэрыялізму» Быхаўскага зьяўляецца яркім прыкладам таго, як подпадпенка філёзофскай спадчыны Леніна, беспартыйнасьць у тэорыі прыводзіць да вораных пралетарыяту вывадаў і канцэпцый. «Нарыс», які ідзе па лініі ме

БАІ ЗА ЦЗІНЬЧЖОУ

У Манчжурыю бязупынна прыбываюць новыя японскія часьці

ШАНХАЙ, 23. Афіцыяльна паведамляецца, што японскія часьці нерайплі ражу Ляо і зараз вядуць аперацыю ў тым раёне, з якога ў лістападзе японскія часьці былі выведзены. З японскіх афіцыяльных бюлетэняў Камюнікэ пя ўказваюцца пазвы гарадоў, куды зараз накіраваны ваенныя часьці. Пачалася вялікая бойка недалёка ад Цяньжуантай на захад ад Інкоу, адбываецца бойка ў Ню Чжуане, куды японцы пасылаюць падмацаваньні. Баі ня спыняюцца каксама недалёка ад Факумыну, які японцамі ўжо занят. Адбыліся баі паміж японскімі і кітайскімі часьцямі ў гарадох Туньцзянкоу і Тамэнліне, якія знаходзяцца каля Факумыну. Такім чынам, японцы адпіхаюць кітайскія часьці ў раён Цзіньчжоу, абыходзячы іх з двух флянгаў з мэтай прымусіць іх адступіць у Жэхол.

У Манчжурыю бязупынна прыбываюць новыя японскія войскі. З Карэі ў Манчжурыю накіраваны падмацаваньні. Мабілізаваны ўсе японскія айскоўцы, якія жывуць у Мукдэне. Паводле ўсеагульнай думкі японская армія зараз уключае ў сябе некалькі десяткаў тысяч салдат звыш «дазволенай нормы» (ТАСС).

Амэрыка благаслаўляе захват Цзіньчжоу

НЮ-ЁРК, 21. Амэрыканскі друк указвае, што дзяржаўны сакратар (амэрыканскі міністар замежных спраў) **Стымсон ня будзе пратэставаць супроць захвату японцамі Цзіньчжоу,** бо амэрыканскі пасол Дауэс патрабаваў і атрымаў у Парыжы праз пасярэдніцтва кітайскага прадстаўніка Шы абяцаньне Нанкіну эвакуяваць Цзіньчжоу. Паводле слоў друку, **Стымсон у сувязі з гэтым хутчэй-бы пратэставаў супроць адмаўленьня кітайцаў эвакуяваць войскі, чым супроць захвату Цзіньчжоу японскімі войскамі.**

***

Пастка, расстаўленая амэрыканскім імпэрыялізмам для японскіх захватчыкаў, заключана ў наступным плане: дыплёматыя даляра на працягу пэўнага часу не перашкаджае захватніцкім дзеяньням Японіі з тым, каб **апошняя па магчымасьці глыбей загрузла ў сваёй авантуры.** Апэтыты акупантаў, якія разгарэліся, павінны стыкнуцца з Англіяй, з аднаго боку, з кітарэсамі СССР—з другога. Спрэчкі нямінуча павінны вырашыцца зброяй, прычым Амэрыка разьлічвае на тое, што Японія выйдзе з гэтага выпрабаваньня значна аслабленай і перамоганай. **Калі правакацыйная стаўка амэрыканскіх імпэрыялістаў на канфлікт паміж СССР і Японіяй біта міраюбівай палітыкай нашага ўраду,** то наступленьне японскіх войск на Цзінчжоў, ухваленае, як гэта відаць з тэлетрам, амэрыканскім міністрам замежных спраў **пачынае ўжо даваць свае рэзультаты.**

Ангельскі буржуазны друк зьмяшчае варожыя артыкулы, накіраваныя супроць Японіі. «Дэйлі геральд» лічыць, што **абвяшчэньне «незалежнасьці» Манчжурыі ёсьць крок да яе канчатковага захвату Японіяй.** Прысяжны орган цьвёрдалобых «Таймс» з пенай па губах напамінае аб тым, што далейшае разьвіцьцё японскай акупацыі б'е непасрэдна па інтарэсах Англіі: у акцыі чыгункі, якая ідзе на тэрыторыі цяперашняга японскага наступленьня, **укладзена ангельскіх капіталаў на суму каля 20 млн. залатых рублёў.** Падкрэсьліваючы актыўнасьць Японіі і ва ўнутранай Манголіі, «Таймс» патрабуе ад Японіі «неадкладных тлумачэньняў». Парэшце, брытанскі ваенны аташэ ў Кітаі Торн хіль дэманстрацыйна лічыць усе японскія паведамленьні аб «канцэнтрацыі бандытаў у раёне Цзіньчжоу» **«недарэчнасьцю», а дзеяньні Японіі незаконнымі.**

На фоне ўсіх гэтых паведамленьняў становяцца зразумелымі паводзіны амэрыканскай дыплёматыі, якая проста або ўскосна, патаемна або яўна патурае дзеяньням японскіх захватчыкаў. **Амэрыка мае цэлы рад сродкаў, якія могуць мець значны ўплыў на Японію. 36 проц. усяго зваротку замежнага гандлю Японіі пры падае на ПАЗШ. 97 проц. японскага экспарту шоўку ўвозіцца ў Амэрыку, 40 проц. усёй патрэбнасьці ў бавоўне і столькі-ж процантаў усёй патрэбнасьці ў сталі Японія здавальняе пры дапамозе ўвозу са Злучаных Штатаў.** Зачыненьне толькі гэтых артыкулаў увозу і вывазу магло-б зрабіць моцны націск на Японію. **Але амэрыканскія імпэрыялісты сьвядома ня ўжываюць гэтых мер. Манчжурская авантура ўжо расхістала ўнутранае становішча Японіі. Яна ўжо падарвала ў вялізарнай ступені крэдыт за граніцай.** Распальваючы і без таго воўчыя апэтыты японскіх захватчыкаў, Амэрыка спадзяецца атрымаць без асобных затрат перамогу над сваім працаўнікам, дзейнічаючы чужымі рукамі.

Хондзіё прадастаўлена свабода дзеяньняў

ТОКІЁ. У колах міністэрства замежных спраў указваюць, што цяперашнія ваенныя дзеяньні ў Манчжурыі **пачаты са згоды вялікіх дзяржаў,** выказаўшы ў апошняй настаноўцы Лігі нацый, у якой прыпяняюцца англійскія «правы» Японіі ў Манчжурыі. Спасылаючыся на аўтарытэтныя крыніцы, друк указвае, што Хондзё прадастаўлена свабода дзеяньняў ім выкананьня загаду ад «начэльства» сёй Манчжурыі ад бандытаў і іншых элемэнтаў, якія пагражаюць парадку» (ТАСС).

Паліцэйскі налёт на сакратарыят міжнароднай антыімпэрыялістычнай лігі

БЭРЛІН, 22. Учора **бэрлінская паліцыя заняла памяшканьне цэнтральнага сакратарыяту антыімпэрыялістычнай лігі і арыштавала ўсіх прытных сакратароў і журналістаў.** Арыштаваныя пятнаццаць грамадзянаў, чужаземцы-ж пакінуты на арыштам.

На запытаньне камуністычнага дэпутата рэйхстагу, генэральнага сакратара лігі **тав. Мюнцэнбэрга** — па якой прычыне паліцыя заняла памяшканьне лігі—паліцыя адмовілася даць адказ. Памяшканьне лігі ўсё яшчэ занята паліцыяй.

БЭРЛІН, 22. У сувязі з паліцэйскім налётам на сакратарыят міжнароднай антыімпэрыялістычнай лігі і арыштам 9-ці чалавек, якія знаходзіліся ў момант налёту ў памяшканьні сакратарыяту, левая пралетарская газэта **«Взольт ам абэнд»** зьмяшчае артыкул, у якім указвае, што **гэты акт паліцэйскага свавольства зьяўляецца рэзультатам умяшаньня чужаземнай дзяржавы.** Паводле слоў газэты, ліга ў апошні час разьвіла ажыўленую дзейнасьць у сэнсе выкрыцьця імпэрыялістычнага захвату Японіяй Манчжурыі. Таму газэта лічыць, што яе мержаваньні ў гэтым сэнсе далёка не пазбаўлены падставы.

«Гэты паліцэйскі акт,—піша газэта,—прадстаўляе сабою спробу **заткрыць грамадзкай думцы рот** пры дапамозе надзвычайнага дэкрэту ў пытаньнях, якія ніякіх адносін да нямецкай унутранай палітыкі ня маюць» (ТАСС).

ПРАВАЛ АНТЫСАВЕЦКАЙ ПРАВАКАЦЫІ

22 сьнежня супрацоўнік НКШЗ гр-н зьвяжуўся ў калегію АДПУ з заявай, у якой ён паведаміў наступнае: працягу трох з лішкам гадоў ён быў аём з членам адной чужаземнай місіі ў Маскве, з якім раней падтрымоўваў ёмства на глебе агульных антыарных інтарэсаў. Паступова, аднак, азаны член чужаземнай місіі стаў прыхіляць ад гр-на Г. весткі адносна становішча чыгунак СССР і ў прыватнасьці весткі аб пабудовах новых чыгунак.

У пачатку сьнежня па ініцыятыве ена місіі гутаркі сталі ісьці выключна вакол пытаньня аб падзеях у Манчжурыі. У адной з такіх гутарак гр-ну быў зроблен намёк на тое, што «каб ў Маскве здарыўся замах на японца пасла ў СССР, дык гэта абавязкова выклікала-б вайну паміж СССР і Японіяй». З прычыны таго, што гр-н адразу не рэагаваў на гэты намёк, ен чужаземнай місіі праз некалькі дзён адкавіў сваю гутарку аб канфлікце на Далёкім Усходзе і потым ужо проста пачаў пераконваць гр-на Г., «што замах на японскага пасла быў-бы вялікай справай», і што гр-н Г. «мог-бы ўзяць на сябе арганізацыю замаху». Пры далейшых спатканьнях член місіі, — як заяўляе гр-н Г., — настойліва паясьняў, што **ГЭТЫ ЗАМАХ НЕАБХОДНА ЗРАБІЦЬ І ШТО ЁН БУДЗЕ МЕЦЬ ЧЫСТА ДЭМАНСТРАЦЫЙНЫ ХАРАКТАР.** Ён гаварыў, што справа ня ў тым, каб абавязкова забіць пасла, а досыць «дзьвёх куль з іржавага нагану ў шыбу японскага консульскага аўтамабіля на вуліцах Масквы».

Настойлівасьць, праяўленая зазначаным членам чужаземнай місіі ў гэтым пытаньні, прымусіла гр-на Г. зрозумець, якая авантура задумваецца супроць Савецкага Саюзу. Гр-н Г. заяўляе, што ён зразумеў, «на якую страшэнную ролю правакатара вайны хацеў яго скарыстаць яго «собеседник». «З прычыны гэтага, — заяўляе гр-н Г., — парашыў падаць ДПУ гэту сваю заяву, я хацеў-бы выкупіць тую цяжкую віну, якую я зрабіў, будучы ўцягнутым па сваёй нявопытнасьці ў падобную брудную і ганебную работу супроць маёй бацькаўшчыны».

Атрымаўшы паведамленьне з паказаньнямі вышэй весткамі аб дзейнасьці члена чужаземнай місіі і аб праверцы некаторых даных у заяве гр-на Г., Народны Камісарыят Замежных Спраў прад'явіў патрабаваньне кіраўніку місіі аб тым, каб названы супрацоўнік у найкарацейшы тэрмін быў адкліканы з СССР, паколькі ён у якасьці асобы, што карыстаецца дыплёматычнай недатыкальнасьцю, ня можа быць судзімы ў Савецкім Саюзе.

Патрабаваньне НК замежных спраў аб ад'езьдзе супрацоўніка місіі задаволена. (ТАСС).

Дэкаднік Камакадэміі закончыўся

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ БАЛЬШАВІЦКАЙ ЛЕНІНСКАЙ НАВУКІ!

Дакладамі тав. **Ральцэвіча** аб барацьбе за ленінізм у філёсофіі і тав. **Вераменічава** аб выніках і пэрспэктывах калгаснага будаўніцтва (21-22 сьнежня) закончыўся дэкаднік Камакадэміі ў БССР. Усе адзінаццаць пасяджэньняў дэкадніка прайшлі з вялікай актыўнасьцю. Усе даклады і шырокае абгаварэньне іх праходзілі пад кутом гледжаньня перабудовы тэарэтычнага фронту ў БССР на аснове ўказаньняў тав. **Сталіна.**

Тав. **Сталін** у сваім апошнім лісьце ў рэдакцыю «Пролетарская революция» не выпадкова ўслед за Леніным падкрэсьлівае неабходнасьць бязьлітаснай барацьбы з найменшымі спробамі рэвізіі марксызму і ленінізму.

Гэты ліст тав. Сталіна заўсёды павінен стаяць у цэнтры ўвагі нашых навуковых працаўнікоў, калі яны шчыра жадаюць на самай справе ўвязаць навуку з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

Праведзены дэкаднік Камакадэміі гэтае палажэньне ярка пацьвердзіў.

Даклады Камакадэміі ахапілі самыя актуальныя пытаньні міжнароднага пралетарскага руху, праблемы сацыялістычнага будаўніцтва, гісторыі, філёсофіі, і прыродазнаўчых навук.

У часе дэкадніка выявілася вялізарная зацікаўленасьць працоўных мас да тэарэтычнай работы. Усе пасяджэньні праходзілі пры перапоўненай залі і ня гледзячы на гэта, толькі прыблізна 1/10 частка ўсіх жадаючых атрымала білеты на даклады.

Трансляцыя пасяджэньняў дэкадніка па радыё, праўда, у гэтых адносінах адыграла асаблівую ролю і дзесяткі тысяч рабочых і калгаснікаў мелі магчымасьці слухаць даклады.

У канцы гутаркі тав. Горын выказвае самую глыбокую падзяку Камакадэміі ад пралетарскай грамадзкасьці БССР за тое, што яна горача адклікнулася на прапанову Беларускай Акадэміі Навук арганізаваць дэкаднік у БССР і падкрэсьлівае, што неабходна, каб сувязь з Камакадэміяй, як цэнтрам марксыцкай навукі, у далейшым яшчэ больш расла і ўзмацнялася.

Паведамленьні

25-XII-г. г. у 6 гадзін вечара, у залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б адбудзецца НАРАДА БАЛЬШАВІКОЎ-ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ СА СТАЖАМ ДА 1916 г. УКЛЮЧНА.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб задачах Таварыства Старых бальшавікоў і стварэньне Беларускага філіялу Таварыства.

(Дакл. т. т. КОКОВІХІН і БАЛЦІН).

2. План работы Беларускага ініцыятыўнага Бюро Таварыства старых бальшавікоў на першы квартал 1932 г. і каштарыс на 1932 г.

(Дакл. т. т. БАЛЦІНА і КЕНІНГА).

Прысутнасьць усіх падпольшчыкаў—членаў КП(б)Б са стажам да 1916 г. уключна абавязкова.

ІНІЦЫЯТЫЎНАЕ БЮРО ПА АРГАНІЗАЦЫІ Ў БССР ФІЛІЯЛУ ТАВАРЫСТВА СТАРЫХ БАЛЬШАВІКОЎ.

— **ПК ЦКК КП(б)Б** просіць зьявіцца ў ПК або паведаміць свой адрас (ці месца працы) наступных т. т.: Ціткевіча, Е. А (Копысь), Казакевіча М. І.— (Полацак), Докшыца А. І. (б. Барковіцкі раён), Тамковіча (Хоцінск.-Бешанковіцк. раёну). Просьба да ўсіх арганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёных таварышоў, паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

— 25 сьнежня г. г., у 6 гадз. веч., у памяшк. Менаркому КП(б)Б склікаецца нарада аб арганізаваным наборы рабсілы на будаўніцтва 1932 г. На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі Наркамправы і Гарінспэктуры працы з матар'ялямі аб вылучэньні раёнаў для бударганізацый, а таксама Калгасцэнтру і РКС. Бударганізацыі: Менбуд, Белдзяржбуд і БЖС павінны зьявіцца з матар'ялямі аб падрыхтаванасьці да набору (вярбовачны апарат, рэзэрвы рабочых, што зроблена ў адносінах набору).

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Пач.: 6: 7-30, 9 і 10-30. Мастацкі фільм **Праект інжынэра Стронга** (цяжкая жыцьця)

„Культура" Пач.: 7, 8-45, 10-30 **БІЧ ЧАСУ** у 6 частках. Звыш праграмы замежная кінадзіна **Пасадка на дачу.**

„Інтэрнацыянал" Мастацкі фільм **Востраў бегляцоў** Звыш праграмы—ХРОНІКА.

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня Мастацкі замежны фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ** Звыш праграмы—ХРОНІКА

„Юны Піянэр" (бу рынак кіно „Культура") Новы мастацкі фільм **ІХНІЯ ВУЛІЦЫ** Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст **Мосжукін.**

25-XII, у 6 гадз. веч., у актавай залі БДУ адбудзецца **агульны гарадзкі СХОД навуковых працаўнікоў** па пытаньні абгавораньня лістa г. Сталіна. Яўка ўсіх навуковых працаўнікоў абавязкова. Ц. Б.

25-га сьнежня, у 10 гадзін, у памяшканьні Камвузу (2-гі паверх, пакой № 25) адбудзецца **агульны сход т-ва марксыстаў-дзяржаўнікаў.**

Парадак дня:

1) Абгаварэньне лістa тав. Сталіна, 2) Рознае.

Прысутнасьць членаў т-ва марксыстаў-дзяржаўнікаў абавязкова.

На сход запрашаюцца: члены праўленьня і супрацоўнікі інстытуту саўбуду і права, савецкі актыў, студэнты аддз. саўбуду і права КУБ'у і інстытуту савецкага будаўніцтва і права.

Дзяржаўны адданалёгічны інстытут НК Аховы Здароўя абвяшчае **КОНКУРС** на замяшчэньне пасад: 1) старшага выкладчыка інстытуту, 2) загадчыка аддзелу сацыяльнай стаматалёгіі.

Заявы з далучэньнем аўтабіяграфіі, водзыву партыйных, савецкіх і прафэсіянальных арганізацый, а таксама сьпісы навуковых прац падаваць на імя дырэктара Інстытуту (Менск, Клініцкі Гарадок, 3-ці корпус) да 10-1—32 г.

24-га сьнежня 1931 г. па вул. Леніна, № 15 **АДКРЫВАЕЦЦА** УНІВЕРСАЛЬНЫ МАГАЗЫН **„ТОРГСІН"** ПАСЫЛЬЧАЯ БАЗА

Продаж усім грамадзянам на замежную валюту і залатую манету (старой чэканкі) і выдача **тавараў прадуктаў** па грашовых пераводах з за-граніцы.

25 сьнежня, у 7 гадзін вечара, у 317 аўдыторыі адбудзецца **Мэтадычная канфэрэнцыя** пляніва-эканамічнага інстытуту па пытаньні: „Аб актыўных мэтадах навучаньня ў інстытуце", Яўка ўсіх навуковых працаўнікоў і студэнтаў інстытуту абавязкова. Дырэкцыя інстытуту.

Праўленьне МЦРК даводзіць да ведама ўсіх установаў, фабрык і заводаў, якія сістаць на забесьпячэньні Менскага Цэрабюру, што яны павінны ПРАДСТАВІЦЬ СЬПІСЫ У СТОЛ ПАЙШЧЫКАЎ па наступнай форме:

№№ чар.	Прозьвішча, імя і імя па бацьку	№ пасп. кніжкі	Пасада	Сьпіс забесьпячэньня	Катэг. забесьпячэньня	Лік утрыманцаў звыш 12 гадоў	Дзеці да 12 гадоў

Сьпісы павінны быць заверены мясцовым камітэтам, камісіяй і адміністрацыяй. Сьпісы павінны быць прадстаўлены **не пазьней 26-XII-31 г.**

У выпадку непрадстаўленьня да вышэйпаказанага тэрміну, будзе тормаз у выдачы наборных дакумэнтаў і своечасовым забесьпячэньні.

Праўленьне МЦРК.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА НА 1932 ГОД

НА ГАЗЭТЫ	Пэрыядычнасьць	На 1 м.	На 3 м.	На 6 м.	На год
ЗЬВЯЗДА орган ЦК КП(б)Б	штодзённа	1—	3—	6—	12—
РАБСЕЛЬКОР орган Культпр. ЦК КП(б)Б. Выданьне газ. „Зьвязда"	Раз у пяцідзьню	—20	—60	1.20	2.40
ОРКА (На польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў пяцідзьню	—25	—75	1.50	3—
РАЎДАНАСІЦ АРТОНС Выдан. ЦК КП(б)Б (На літоўскай мове)	Раз у пяцідзьню	—	—45	—90	1.80
НА ЧАСОПІСІ:					
Бальшавік Беларусі Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў месяц	—40	1.20	2.40	4.80
Работніца і калгасніца Беларусі Выданьне ЦК КП(б)Б	3 разы ў месяц	—20	—60	1.20	2.40

Падпіска прымаецца: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

„ЗА ТЕМПЫ КАЧЕСТВО, ПРОВЕРКУ" — ДВУХТЫДНЕВАЯ КІРУЮЧАЯ ЧАСОПІСЬ — ОРГАН ЦКК РСІ СССР, пад рэдакц. Ем. Ярославскага.

ЧАСОПІСЬ мабілізуе ўвагу мас на праверку выкананьня пастаноў партыі і ўраду, на паляпшэньне работы ўсяго дзяржаўнага, гаспадарчага і кааперацыйнага апарату асаблівую ўвагу аддае прыцягненьню мас да кіраваньня дзяржавай і барацьбе з бюракратызмам.

ЧАСОПІСЬ разьлічана на работнікаў КК РСІ на шырокі актыў, які прымае ўдзел у масавым пралетарскім кантролі сацыялістычнае рабоце РСІ, на работнікаў шэфскіх брыгад, сэкцый РСІ сацэйнасьці РСІ на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, лёгкую кавалерыю, а таксама на гаспадарнікаў, партыйнага прафсаюзных работнікаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1932 ГОД праводзіцца ўсюды на пошце

Падпісная цана: — на 12 мес. (24 №№)—7 руб. — „ 6 „ —3 „ 50 к. „ 3 „ —1 „ 75 к.

Адрас: Изд-во „ТЕХНИКА УПРАВЛЕНИЯ" Москва, Центр, Ильинка, Рыбный пер. 2, пом. 28.

1-ы Усебеларускі зьезд т-ва „Аўтадор" адкрываецца

25-га сьнежня 1931 году, у 7 гадз. вечара,

у нюёбе харчавіноў (рог Камсамольскай і Інтэрнац. вул.)

ПАРАДАК ДНЯ НАСТУПНЫ:

1. Даклады ЦС і ЦП Таварыства „Аўтадор".
2. Даклад Галоўдартрансу аб пэрспэктывах аўтамабілізацыі БССР, плян дарожнага будаўніцтва і выкананьні пляну дарбудаўніцтва за 1931 г.
3. Выбары.

Пасяджэньне фракцыі КП(б)Б—у 6 гадз. вечара.

Рэгістрацыя дэлегатаў у ЦП Аўтадору БССР (Савецкая вул. № 82)

Дзеньнік сэсіі ЦВК СССР

Ранішняе пасяджэньне 23-га сьнежня

У парадку дня ранішняга пасяджэньня працяг дакладу аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі 1931 году. На трыбуне, спатканы доўгімі аплёдысмэнтамі, тав. **Куйбышаў.** Яго насычаны фактамі і лічбамі даклад, які асьвятляе дасягненьні за мінулыя гады, малюе карціну далейшага бурнага разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі ў 1932 годзе.

З неаслабнай увагай заля заслухоўвае даклад тав. Куйбышава.

Тав. Куйбышаў канчае свой даклад наступнымі словамі: «Выкананьне на родна-гаспадарчага пляну 1932 году мае сусьветна-гістарычнае значэньне і зьяўляецца справай гонару рабочае клясы і калгаснага сялянства. Рабочая кляса СССР дае абяцаньне прайсьці за 4 гады шлях, разьлічаны на 5 год. Выкананьне пяцігадовага пляну за чатыры гады пераканае рабочую клясу ўсяго сьвету, што наш шлях ёсьць адзіны шлях выхаду з голаду, галечы і беспрацоўя».

Апошнія словы тав. Куйбышава пакрываюцца бурнымі воплескамі. На гэтым канчаецца ранішняе пасяджэньне сэсіі ЦВК.

(Вячэрняе пасяджэньне 23-га сьнежня

Увечары 23 сьнежня на сэсіі ЦВК пачаліся спрэчкі па дакладах т.т. Молатава і Куйбышава. Саюзны савет і савет нацыянальнасьцей абмяркоўвалі даклады асобна.

Пасяджэньне саюзнага савету адкрыў тав. Пятроўскі. Выступленьні членаў савету выліліся ў дэманстрацыю дасягненьняў і посьпехаў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Выступаўшыя дэлегаты розных рэспублік, краёў і абласьцей Савецкага Саюзу рабілі справаздачы перад усёй савецкай грамадзкасьцю ў асобе сэсіі аб вялізарнай рабоце, праробленай на мясцох. Па-ізоляваму абмяркоўвалі прадстаўленыя Дзяржплянам кантрольныя лічбы на 1932 год і запэўнялі сэсію, што пралетарска-калгасныя масы, якія яны прадстаўляюць, гатовы па-бальшавіцку змагацца за завяршэньне ў наступным годзе пляну першай пяцігодкі.

У спрэчках на вячэрнім пасяджэньні выступалі наступныя т.т. **Тыунаў** (Заходняя Сібір), **Казлоў** (Нижняя Волга), калгасьніца Паўночнага Каўказу Васільчанка, Прадчэнка (Паўночны край), Кузьменка (УССР).

Ад імя 25-тысячнага калектыву будаўнікоў Уралмашбуду выступіў начальнік будаўніцтва тав. **Баньнікаў; Былаеў** (Ленінград), калгасьніца **Казакевіч** (БССР), **Дорын** (Падмаскоўны вугальны басэйн), **Булашоў** (Башкірыя), **Півавараў** (Паўночны Каўказ), **Пальнін** (Мордаўская вобласьць), **Пулумбэтаў** (Казакстан) і **Хацкевіч** (БССР).

А. ІВІН

ЯПОНСКАЯ ІНТЭРВЭНЦЫЯ У МАНЧЖУРЫІ І АМЭРЫКАНСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

«У замежнай палітыцы Злучаных Штатаў павінны ставіць ціхаакіянскую праблему на першы плян; пытаньні, якія датычаць Паўднёвую і Цэнтральную Амэрыку — на другі і, парэшце, еўрапейскія пытаньні — на трэці... Ціхаўленасьць Злучаных Штатаў сам Кітая больш вялікая, чым якойтам ні было з эўрапейскіх дзяржаў»—так сьцьвярджаў адзін з выдатных амэрыканскіх экспэртаў у ціхаўсходніх справах, падагульваючы вынікі вашынгтонскай канфэрэнцыі.

Як відома, гэтай канфэрэнцыяй увага адсоўвалася на другі плян. На першы японскай схемы тэрытарыяльнага падзелу Кітая, пры якім львіная доля адыходзіла да Японіі, ПАЗШ, ведаючы прыкрываючыся маскай інтэрэсаў прыцялеца Кітая», у рэшце-рэшт высоўвалі сваю схему падзелу ў выглядзе эксплёатацыі гэтай дзікай краіны проста-прапарцыянальна фінансавай і эканамічнай магутнасьці дужнай вялікай дзяржавы, але пад кіраўніцтвам Амэрыкі.

Апошнім момантам рэалізацыі гэтай схемы зьяўлялася славутая «згода дзевяці дзяржаў». Гэта добра разумелі ня толькі ў Токіё, але і ў Парыжы. Адсюль нязвычайная мардушасьць японіх пры ратыфікацыі «згоды», рэшта, якая вельмі пэрвова трымалася ў той час Вашынгтонам.

«Будзе дрэнна—пагражаў адмірал Фэльбс у адным з сваіх публічных выступленьняў,—калі згода 9 дзяржаў ня ўбачыць ратыфікацыі. Гэта пакажа, што цяперашнія намаганьні Амэрыкі дасягнуць аднадушша ў далёка-ўсходняй праблеме шляхам згоды і супрацоўніцтва, аказалася дарэмнымі. Таму нельга папракаць Амэрыку, калі яна самастойна прыдзе на дапамогу Кітаю. Папракаць прыдзецца тыя дзяржавы, якія ў даны момант так горача стаяць за Лігу Нацый. Апошняя акалічнасьць даказвае, што па сутнасьці дзеяньні Лігі нацый разьлічаны толькі на тое, каб яшчэ больш узмацніць і ўзбагаціць буйныя дзяржавы за кошт слабых народаў. Супрацоўніцтва ў далёка-ўсходніх справах вядзе да працяглага міру, адмаўленьне ў гэтым супрацоўніцтва, адмаўленьне ад ратыфікацыі згоды дзевяці дзяржаў нямінуча вядзе да вайны».

Гэта ня было безадказным выступленьнем безадказнага адмірала. Апошні ў даным выпадку зьяўляецца толькі рупарам Вашынгтона.

«Згода дзевяці дзяржаў» была неўзабаве ратыфікавана ўсімі яго ўдзельнікамі.

Зараз гэта згода адкрыта парушана Японіяй. Зараз Ліга нацый, карыстаючыся выпадкам, зноў «разьлічвае толькі на тое, каб яшчэ больш узмацніць і ўзбагаціць буйныя дзяржавы за кошт слабых народаў». Таму сапраўды зараз «нельга папракаць Амэрыку, калі яна самастойна прыдзе на дапамогу Кітаю».

Але чаму-ж Амэрыка ня прыходзіць? Чаму прымоўклі ваяўнічыя адміралы Фэльбсы? Дзе морскія міністры Вільбуры, якія пагражаюць ахаладзіць «гарачы тэмпэрамэнт» Японіі «кавалкам халоднай сталі»? Што думае член кангрэсу Брытэн аб сваім «саюзе ўсіх белых нацый Піхага акіяну супроць японскай небясьпекі?».

Член кангрэсу Брытэн запатрабаваў ў даны момант антысавецкай правакацыяй. Фэльбсы і Вільбуры ўжо «трацяць твар», а Вашынгтон энэргічна працуе разам з Лігай, пагражаючы Японіі вайной... з Савецкім Саюзам.

Амэрыканскі ўрад,—піша «Асошыэйтэд Прэс»,—паведаміў Японію, што, па думцы ПАЗШ, акупацыя Цынцыкара ў сферы савецкага ўплыву ў Паўночнай Манчжурыі пагражае сур'ёзнымі ўскладненьнямі».

«Калі Японія,—стакоўча даказвае амэрыканскі штотыдневік «Чайна уікілі рэв'ю», — шукае смуты ў Манчжурыі, яна рызыкуе раздражніць дзяржаву, якая ў стане даць сур'ёзны і неадкладны адпор. Сумніцельна, каб руская замежная палітыка змагла вывесьці пастаянную прысутнасьць у Манчжурыі імпэрыялістычнай дзяржавы. Яшчэ некалькі неабдуманых хадоў з боку японскага ваеннага міністэрства і цяперашні канфлікт у Манчжурыі стане трохбаковым».

Як відаць, амэрыканскі ўрад скромна ступоўваецца і толькі «прыяцельскі» папярэджвае Японію аб пагражаючай небясьпецы, а амэрыканская праса з пявіным выглядам і вялікім азартам пускаецца ў разважаньні аб тым, што зможа і чаго ня зможа вынесьці «руская замежная палітыка».

Між тым у сапраўднасьці-ж пытаньне стаіць пакуль інакш, а іменна: зможа ці ня зможа «амэрыканская замежная палітыка» вывесьці публічную аплявуху, атрыманую ёю ад японскага імпэрыялізму, і такім чынам прызнаць сваё бясьсільле прымірыцца з поўным паражэньнем у вырашэньні па амэрыканскай схэме ціхаакіянскай праблемы, якую Амэрыка, пачынаючы з вашынгтонскай канфэрэнцыі, высоўвала на першы плян. Дачы ле, як мы бачылі, больш важнай, чым усе пытаньні, якія датычаць як Эўропы, так і Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі.

Што датычыць «амэрыканскай боязьні» адносна таго, што «цяперашні канфлікт у Манчжурыі стане трохбаковым», то ў сапраўднасьці Вашынгтон ня толькі гэтага не баіцца, але наадварот,—**усімі сіламі да гэтага імкнецца, і, напэўна, не адступіць ні перад якой правакацыяй.**

«Неабходнасьць для амэрыканскага ўраду,—пісаў вядомы амэрыканскі спэцыяліст Томас Мілард у сакрэтным дакладзе ад 20 студзеня 1922 г., —атрымаць дапамогу з Сібіры ў выпадку вайны паміж Злучанымі Штатамі і Японіяй было ўжо ўказана ў папярэднім мэмарандуме. У ДАНЫ МОМАНТ, З ПУНКТУ ПОГЛЯДУ СТРАТЭГІЧНАГА, СПРЭЧКІ І АНТАГАНІЗМ ПАМІЖ ЯПОНІЯЙ І РАСІЯЙ СПЭЦЫЯЛЬНА НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ — У ІНТАРЭСАХ АМЭРЫКІ».

«Японія,—чытаем мы ў папярэднім мэмарандуме,—ня мае на сваёй тэрыторыі ўсіх неабходных элемэнтаў, ні нават выстарчальнай колькасьці іх, каб весьці доўгую вайну з першаклясным дзяржавай» (Амэрыкай). Таму

«неадкладна пасьля абвяшчэньня вайны (магчыма і раней) яна акупуе Манчжурыю, Прымамурскую вобласьць і ўсходні Шаньдунь. Можна чакаць, што ў выпадку вайны, Японія возьме таксама пад свой кантроль КУЧ і захопіць у вышэйназваных мясцовасьцях усе руднікі і г. д. Пры дапамозе свайго флёту, а таксама мінных загарод і іншых спосабаў абароны, Японія зможа забясьпечыць бязупынныя зносіны з Паўночным Кітаем, Манчжурыяй і Сібірам і такім чынам перакінуць у Манчжурыю, Шаньдунь, Сібір і Карэю амаль любую колькасьць войск... Калі Японіі ўдасца ўтрымацца там, то гэта па сутнасьці будзе азначаць паражэньне Амэрыкі. Геаграфічныя ўмовы Японіі, як і магутнасьць яе морскіх і сухаземных сіл, гарантуюць ад амэрыканскага дэсанту на тэрыторыі японскія ўладаньні на астравох, але і ўсё ўсходняе ўзьбярэжжа Азіі.

Стварэцца такім чынам становішча, з якім Японія ня справіцца, калі на дапамогу ня прыдуць саюзьніі з кантынэнту Азіі. Аднак, у гэтай дапамозе сумняваецца нам амаль ня прыходзіцца. Японія будзе вымушана з самага пачатку вайны зьвярнуцца да дзеяньняў, якія вы клічуць абурэньне супроць яе з боку Кітая і Расіі».

Праўда усё гэта пісалася яшчэ дзесяць год таму назад. За гэтыя гады можна без перапавялічэньня сказаць, сілы Савецкага Саюзу ўдзесяцярыліся. Больш таго, Савецкі Саюз стаў непераможным. Але іменна таму ў дадзены момант (калі супярэчнасьці паміж японскімі і амэрыканскімі імпэрыялістамі непараўнальна большыя, чым дзесяць год таму назад), пры тым ужо ня толькі «з пункту гледжаньня стратэгічнага, але і з усіх пунктаў гледжаньня «спрэчкі і антаганізм на Далёкім Усходзе — у інтарэсах Амэрыкі».

Адсюль нагляя выступленьні Брытэнаў, крывадушная «боязьнь» амэрыканскай прэсы, «двухзначныя адносіны амэрыканскага ўраду да «манчжурскіх падзей» і яго нядвузначная правакацыя, якая імкнулася ўцягнуць Японію ва ўзброены канфлікт з СССР.

Амэрыканская буржуазія прагне новых войн, новых патокаў крыві, новых масавых забойстваў і новых паходаў. Амэрыканскія імпэрыялісты імкнуцца раздуць новы сусьветны пажар. Яны са скуры лезуць, каб пакаваць Японію на СССР і тым самым выклікаць вайну паміж імі, каб сарваць нашу пяцігодку, а, з другога боку,—аслабіць Японію для надыходзячай барацьбы за панаваньне на Ціхім акіяне. З гэтай мэтай амэрыканскі імпэрыялізм прабуе справаакаваць Савецкі Саюз на вайну.

Але гэта ім ня ўдасца. Мірная палітыка Савецкага Саюзу вядома працоўным усяго сьвету.